**АНГЛІЙСКА-БЕЛАРУСКІ**
**СЛОЎНІК**

**ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ ШКОЛЬНАГА ВЕКУ**

Мой юны сябар,

гэты слоўнічак складзены для таго, каб дапамагчы табе перакладаць школьныя тэксты, трошкі палегчыць жыццё і навучыцца англійскай мове. Слоўнічкі, што маюць падручнікі, звычайна не ўтрымліваюць багата якіх словаў, што надта нязручна. Вось і паспрабаваў я сабраць разам словы з усіх цяперашніх падручнікаў, дадаць словы з падручнікаў мінулых гадоў і стварыць гэтую кніжачку.

Я хацеў, каб слоўнічак быў невялікі, каб ім было зручна і проста карыстацца. Таму, вядома, у ім таксама не будзе ўсіх англійскіх слоў, але самае-самае патрэбнае ты ў ім, канешне, знойдзеш.

Нажаль, з тэхнічных прычын, слоўнічак не мае транскрыпцыі. Але табе дапамогуць школьны падручнік і настаўнік. Галоўнае- ведаць значэнне слова.

Ведаючы, што ў цябе заўсёды ёсць праблемы з "няправільнымі" формамі дзеясловаў, я вынес іх у рэестр слоўніка.

Літары *pi*, *pp* абазначаюць адпаведна past indefinite і past participle, то бо формы простага мінулага часу і дзеепрыметнік мінулага часу. /Як ты ведаеш, у правільных дзеясловаў гэтыя формы супадаюць./

**ger**- значыць герунд.

У прыкладах рэестравае слова замяняецца першаю літараю. Так, слова **deep** у прыкладзе **two metres d.** пазначана літараю **d.,** і таму трэба чытаць прыклад як **two metres deep.**

Памятай таксама, што ў англійскай мове адно і тое ж слова можа быць назоўнікам, дзеясловам і прыметнікам. Таму, скажам, слова **control** можа значыць і "кантроль" і "кантраляваць" і "кантрольны".

У англійскай мове няма закончанага і незакончанага трывання, у ёй **to read** значыць "чытаць" і "прачытаць". Таму пры перакладанні трэба зважаць на закончанае і незакончанае трыванне беларускага дзеяслова, падбіраць слова. І так у багата якіх выпадках, таму, перакладаючы, трэба прымяркоўвацца

Рэестр гэтага слоўнічка абмежаваны пераважна лексікаю школьных тэкстаў, але ён дастаткова багаты. Пра значэнне многіх словаў, якіх у слоўнічку няма, можна здагадацца, разглядаючы іхнюю марфалагічную будову. Так, у корпусе слоўніка няма слова **dedication**, але ёсць **dedicate**. Ведаючы, што суфікс **-tion** утварае назоўнікі, можна смела меркаваць, што слова **dedication** мае сэнс "прысвячэнне". Так яно і ёсць. Таму веданне прыставак і суфіксаў значна паляпшае тваe магчымасці і веды.

У канцы слоўнічка ты знойдзеш спіс геаграфічных назваў. Ён зусім кароценькі і няпоўны. Зрэшты, гэта не самыя частыя словы ў школьных тэкстах і шмат якія назвы можна папросту адгадаць.

Вучыся, разумней.

Жадаю табе поспехаў у цяжкой і нуднаватай справе вывучэння англійскай мовы. Затое як добра, калі ўсё разумееш! Бывай.

Дзядзька Мікола.

в. Дуброва, кастрычнік 2006г

**Англійскі алфавіт**

**Aa Bb Cc Dd Ee Ff Gg Hh Ii Jj Kk Ll Mm Nn Oo Pp Qq Rr Ss Tt Uu Vv Ww Xx Yy Zz**

## A

**a** *неазначальны артыкль*; нейкі, нейкая
**abandon** пакідаць; адмаўляцца ад
**ability** здольнасць; уменне
**able** здольны; ***to be a***. магчы
**aboard** на борце
**abolish** скасаваць, адмяніць
**abominable** жахлівы
**about** пра; прыблізна, каля; ***to be a***./ ***around*** быць паблізу
**above** над; ***a. all*** перад усім
**abroad** за мяжою
**absent** адсутны; ***to be a***. адсутнічаць
**absolutely** абсалютна
**abuse** злоўжываць
**accept** прымаць, пагаджацца
**accident** няшчасны выпадак, аварыя
**accompany** суправаджаць
**accomplish** выканаць, здзейсніць
**accord** згода
**according**: ***a. to*** згодна з, па, паводле
**accurate** дакладны
**accuse** вінавáціць (of y)
**accustomed** прызвычаены; ***to get a. to*** прывыкнуць, прызвычаіцца да
**ache** боль; балець
**achieve** дасягаць; ***to a. victory over*** дасягнуць перамогі над
**achievement** дасягненне
**acid** кіслата; кіслы
**acquire** набыць, атрымаць
**across** цераз, праз, па
**act** дзеянне, акт; дзея /*п'есы*/; дзейнічаць; іграць /*у спектаклі*/
**acting** ігра /*актораў*/; дзейны
**action** дзеянне; учынак
**active** актыўны, дзейсны; незалежны /*стан дзеяслова*/
**activity** дзейнасць; актыўнасць; ***a.ties*** заняткі
**actor** актор
**actress** акторка
**add** дадаць
**addition** дадатак; складанне; ***in a. to*** у дадатак да
**additional** дадатковы
**address** адрас, выступ; выступаць /*перад кім-н.*/
**addressee** адрасат
**adjective** прыметнік
**admiration** захапленне
**admire** захапляцца
**admit** упускаць, дапускаць, прызнаваць
**adolescent** падлетак
**adopt** прымаць
**adore** абагаўляць, захапляцца
**adsurd** абсурдны
**adult** дарослы
**advance** прагрэс, рух наперад; рухацца/ прасоўвацца наперад
**alvantage** перавага, карысць
**adventure** прыгоды
**adverb** прыслоўе
**adversary** праціўнік
**advertise** рэкламаваць
**advertisment** рэклама
**advice** парада; ***sound a***. слушная парада
**advise** раіць
**affair** справа
**affect** уплываць, уздзейнічаць
**affirmative** сцвярджальны
**afford** прыносіць /*радасць і пад*/; /*звычайна з дзеясл.* can/ дазваляць сабе, патраціцца
**afraid** спалоханы; ***to be a. of*** баяцца *чаго-н.*
**African** афрыканскі; афрыканец
**after** пасля, праз; па, згодна з; паводле; ***a. a while*** неўзабаве, праз нейкі час; ***a. some time*** праз нейкі час; ***a. all*** урэшце рэшт
**afternoon**: ***in the a***. пасля абеду
**afterwards** пазней, потым, у наступным
**again** зноў; ***over and over a***. увесь час, настойліва, яшчэ і яшчэ раз
**against** супраць; у, аб
**age** узрост, век; ***at the a. of*** ва ўзросце
**ago** таму; ***two years a***. два гады таму
**agree** (*не ўжываецца ў present continuous*) згаджацца, пагаджацца
**agreement** пагадненне, згода
**agricultural** сельскагаспадарчы
**agriculture** сельская гаспадарка
**agronomist** аграном
**Aids** снід

**aim** мэта; ***to a. at*** скіроўваць на, мець на мэце
**air** паветра; праветрыць
**air-mail** авіяпошта
**airport** аэрапорт
**alarm clock** будзільнік
**alike** падобна, аднолькава
**alive** жывы
**all** усё, увесь, усе; ***a. right*** добра, ладна; ***at a***. наогул, зусім; ***a. over the world*** ва/ па ўсім свеце
**allow** дазваляць
**almost** амаль
**alone** адзін
**along** уздоўж, усцяж; ***a. with*** разам з
**aloud** уголас
**already** ужо
**also** таксама
**although** хоць
**always** заўсёды
**a. m.** да паўдня, у першую палову дня; ***at 10 a.m. a*** дзесятай гадзіне раніцы
**am** *1 а. адз. л. цяперашняга часу дзеяслова* to be
**ambassador** пасол
**ambition** памкненне; амбіцыя
**American** амерыканец; амерыканскі
**among** сярод, між
**amount** колькасць, агульная сума; складаць, быць роўным; ***a. of money*** сума грошай
**amuse** забаўляць, цешыць
**amusement** забаўка
**amusing** пацешны, забаўляльны
**an** *неазначальны артыкль, ужываецца толькі перад словамі, што пачынаюцца на галосны*
**ancient** старажытны
**and** і; а; ***a. so on*** і г.д., і гэтак далей
**anger** гнеў
**angle** кут, вугал
**angry** сярдзіты, незадаволены; ***to be a***. злавацца; ***to get a***. раззлавацца, разгневацца
**animal** жывёла; жывёльны
**anniversary** угодкі, гадавіна
**announce** абвяшчаць
**another** іншы, другі
**answer** адказ; адказваць
**ant** мурашка
**any** любы, усялякі; /*у пыт. сказах*/ які-небудзь; /*у адм. сказах*/ ніякі; ***a. more*** яшчэ, болей
**anybody** любы; /*у пыт. сказах*/ хто-небудзь; /*у адм. сказах*/ ніхто
**anyhow** як-небудзь
**anymore** болей; цяпер ужо
**anyone** = anybody
**anything** усё, усё, што хочаш, што-небудзь; /*у пыт. сказах*/ што-небудзь; /*у адм. сказах*/ нічога
**anyway** як-небудзь, любым чынам; ніяк /*у адмоўных сказах*/; усёроўна, прынамсі
**anywhere** усюды, дзе-хочаш; /*у пыт. сказах*/ дзе-небудзь, куды-небудзь, дзесьці; /*у адм. сказах*/ нідзе
**apartment** кватэра, пакой
**apologize** выбачацца, прасіць прабачэння
**appeal** звяртацца; зварот
**appear** з’яўляцца; вынікаць; ***it a.ed*** аказалася
**appearance** знешнасць
**appetite** апетыт
**applaud** пляскаць у ладкі; ухваляць
**applause** воплескі, апладысменты
**apple** яблык
**apple-tree** яблыня
**apply** ужываць, прымяняць; звяртацца
**appoint** прызначаць
**appreciate** цаніць, шанаваць
**approach** падыход; падыходзіць, набліжацца
**approve** ухваляць
**April** красавік
**architect** архітэктар
**architecture** архітэктура
**are** *мн. л. цяперашняга часу дзеяслова* to be
**area** плошча; абшар; галіна, сфера
**arena** арэна
**aren’t** = are not
**argue** спрачацца, пярэчыць
**argument** спрэчка
**arm** рука /*ад ручыцы да пляча*/; узбройваць
**armchair** крэсла
**army** армія, войска
**around** вакол
**arrange** ладзіць, ладкаваць

**arrest** арышт; арыштаваць
**arrival** прыход, прыезд, прыбыццё
**arrive** прыязджаць, прыходзіць
**art** мастацтва
**article** артыкул; артыкль; тавар
**artist** мастак, артыст
**as** у той час як; паколькі; як; ***as**... **as***...гэткі ж... як..; ***as far as*** да /*якога-н. месца*/, наколькі; ***as if*** як быццам; ***not so... as***... не такі... як...
**ashamed**: ***to be a. of*** саромецца *чаго-н.*
**Asian** азіят; азіяцкі
**ask** пытаць; прасіць; ***to a. for*** прасіць *што-н.*
**asleep**: ***to be a***. спаць; ***to fall a***. заснуць
**aspect** від, аспект
**assistant** памочнік
**astonish** здзіўляць
**astonishment** здзіўленне
**astronomy** астраномія
**at** ля, каля; за; ***at last*** урэшце; ***at least*** прынамсі
**ate** *pi да* eat
**athletic** атлетычны; ***a. sports*** лёгкая атлетыка; ***a.s*** атлетыка
**atmosphere** атмасфера
**attack** напад; нападаць, атакаваць
**attempt** спроба; спрабаваць
**attend** наведваць, хадзіць (*куды-н.*), прысутнічаць; ***to a. school*** хадзіць у школу, вучыцца ў школе
**attention** увага; ***to pay a***. зважаць, звяртаць увагу
**attentive** уважлівы
**attentively** уважліва
**attitude** пастава; стаўленне
**attract** прыцягваць, вабіць
**attractive** прывабны, мажны
**audience** публіка; аўдыторыя
**August** жнівень
**aunt** цётка
**Australian** аўстраліец; аўстралійскі
**Austrian** аўстрыец; аўстрыйскі
**author** аўтар, пісьменнік
**autumn** восень
**available** наяўны, які ёсьць***; to be a***. быць, мецца
**average** сярэдні
**avoid** унікаць *чаго-н.*, ухіляцца ад
**awake** прачынацца
**award** узнагарода; прысуджаць /*прэмію, узнагароду*/
**away** прэч; на адлегласці; ***to go a***. пайсці; ***to run a***. уцячы; ***to take a.*** забраць, прыняць
**awkward** нязграбны, няўклюдны нязручны
**awoke** *pi да* awake
**awoken** *pp да* awake
**awful** жудасны, жахлівы
**axe** сякера

## B

**baby** дзіця
**bacon** бекон, сала
**back** спіна, плечы; задні; ***b. door*** службовыя/ чорныя дзьверы; назад; ***to be b***. вярнуцца; ***at the b. of*** ззаду, за
**backward** адсталы
**bacon** сала, бекон
**bad** дрэнны, паганы; /*боль*/ моцны; ***b. luck*** няўдача, нешанцаванне
**badly** вельмі, моцна; цяжка, дрэнна; ***b. wounded*** цяжка паранены; ***I need the book b***. кніга мне пільна патрэбна
**bag** торба, сумка
**bake** пячы
**balance** раўнавага
**balcony** балкон
**bald** лысы
**ball** мяч, шар
**ballet** балет; балетны
**ban** забарона; забараняць
**band** аркестр
**bank** банк; бераг ракі
**banner** сцяг
**bar** бар, шынок, карчма; ***b. of chocolate*** плітка шакаладу
**barber** цырульнік /*мужчынскі*/
**bare** голы
**bark** брахацьб гаўкаць
**barley** ячмень
**barrel** бочка; барэль /*літаральна* “бочка”, *гандлёвая мера нафты*, *каля 159 л*/
**base** база; грунт; засноўваць; ***to be b.d on***

грунтавацца на, засноўвацца на
**basic** асноўны, галоўны
**basis** аснова, грунт; ***on the b. of*** на аснове/ грунце *чаго-н.*
**basket** кошык
**basket-ball** баскетбол
**bath** ванна
**bathe** купацца
**bathroom** ванны пакой
**battle** бітва, змаганне
**bay** затока
**be** (*pi* was/ were, *pp* been) быць, існаваць, знаходіцца; *як дапаможны дзеяслоў не перакладаецца;* ***to be born*** нарадзіцца; ***to be on*** ісці /*пра кінафільм, спектакль*/, быць уключаным, гарэць; ***to be out*** быць выключаным, патухці; ***to be over*** канчацца; ***to be*** + *inf* павінен, мусіць
**beach** бераг мора, пляж
**bear** I трываць, выносіць; насіць; нараджаць; ***to b. fruits*** прыносіць плён
**bear** II мядзведзь
**beast** звер, жывёліна
**beat** стукаць, біць; *pi да* beat
**beaten** *pp да* beat
**beautiful** прыгожы
**beauty** прыгажосць, краса
**beaver** бабёр
**became** *pi да* become
**because** бо, таму што; ***b. of*** з-за, з прычыны
**become** рабіцца, станавіцца; *pp да* become
**bed** ложак, пасцель
**bedroom** спальны пакой, спальня
**bee** пчала
**beef** ялавічына
**been** *pp да* be
**beer** піва
**beetle** жук
**beetroot** бурак
**before** перад, раней, таму назад, за, да, перад тым як
**beg** прасіць; ***I b. your pardon!*** Прашу прабачэння!
**began** *pi* да begin
**begin** пачынаць
**beginning** пачатак; ***at the b***. напачатку, спачатку; ***from the very b***. ад самага пачатку
**begun** *pp* да begin
**behave** паводзіць сябе
**behaviour** паводзіны
**behind** за, ззаду
**being**: ***a human b.*** чалавек; ***human b.s*** людзі
**Belarusan** беларус; беларускі
**believe** па/верыць, меркаваць
**bell** звон, званок
**belong** належаць; ***it b.s to me*** гэта належыць мне
**belonings** *pl* рэчы
**below** ніжэй, унізе, пад
**belt** папруга, рэмень, пояс
**bench** лаўка, услон
**bend** гнуць, гнуцца, схіляць, схіляцца
**beneath** пад
**bent** *pi, pp да* bend; сагнуты
**berry** ягада
**beside** побач, каля, ля
**besides** акрамя таго, апрача
**best** найлепшы; больш за ўсё, найлепей; ***to do one's b***. пастарацца, прыкласці ўсе намаганні
**better** лепей, лепш; had better +*inf* /*без to*/ лепей /*зрабіць што-н.*/
**between** паміж, між; ***b***... ***and***... з/ад... да...
**beyond** па-за, за, акрамя
**bicycle** веласіпед
**big** вялікі
**bike** веласіпед
**bill** рахунак; афіша /*тэатральная*/; дзюба
**billion** мільярд
**bin** кантэйнер; сметніца
**bind** звязаць
**biography** жыццяпіс, біяграфія
**biology** біялогія
**bird** птушка
**birth** нараджэнне
**birthday** дзень народзінаў/ нараджэння
**biscuit** пячэнне
**bit** I кавалачак; ***a b***. крышку, трошачкі
**bit** II *pi*, *pp да* bite
**bite** укус; кусаць, клюнуць
**bitten** *pp да* bite; пакусаны, укушаны
**bitter** горкі
**black** чорны
**blackboard** класная дошка

**blade** лязо; лопасць
**blame** вінаваціць
**blanket** коўдра
**blazer** пінжак
**blew** *pi да* blow
**blind** сляпы
**block** кубік; блок; ***b. of flats*** шматпавярховы дом; блакаваць, перагарадзіць
**blood** кроў
**blouse** кофта
**blow** удар; няшчасце; дзьмуць
**blown** *pp да* blow
**blue** сіні
**boar** дзік
**board** дошка; борт; управа, міністэрства; сесці на карабель
**boast** хваліцца
**boat** лодка, параход
**body** цела; орган /*кіроўны*/; арганізацыя
**bog** балота
**boil** варыць, кіпяціць, кіпець
**bomb** бомба; бамбардаваць, абстрэльваць
**bone** костка
**book** кніга; набываць білеты
**bookcase** кніжная шафа
**booking office** білетная каса /*чыгуначная*/
**bookshop** кнігарня
**boot** бот
**border** мяжа
**bore** *pi* да bear I
**boring** нудны, сумны
**born** *pp да* bear I; народжаны: ***to be*** b. нарадзіцца
**borrow** браць у пазыку, пазычаць
**boss** начальнік, гаспадар
**botany** батаніка
**both** абое, абодва, абедзьве; ***b... and*** i... i..
**bother** турбаваць, непакоіць
**bottle** пляшка, бутэлька
**bottom** дно; ***at the b***. унізе
**bought** *pi*, *pp да* buy; куплены
**bowl** міска
**box** скрынка, скрыначка, карабок
**boxing** бокс /*спорт*/
**box-office** тэатральная каса
**boy** хлопец
**boyfriend** сябар, сябрук /*дзяўчыны*/
**boycott** байкот; байкатаваць
**brain** мозг
**branch** галіна; аддзяленне, кантора
**brave** мужны, адважны
**Brazilian** бразілец; бразільскі
**bread** хлеб
**break** перапынак; ламаць, ламацца
**breakfast** снеданне; ***to have b***. снедаць
**brick** цагліна; цэгла; цагляны
**bride** нявеста
**bridegroom** жаніх
**bridge** мост
**brief** кароткі, непрацяглы; ***in b***. коратка
**bright** яркі
**brilliant** бліскучы; выбітны
**bring** прыносіць, прыводзіць***; to b. about*** выклікаць, спараджаць; ***to b. up*** выхоўваць, гадаваць /*дзяцей*/***; to b. to ruin*** разарыць
**British** брытанец; брытанскі
**broad** шырокі
**broadcast** весці перадачы, перадаваць (*па радыё*)
**broke** *pi да* break
**broken** *pp да* break; зламаны
**brook** ручай
**broom** венік
**brother** брат
**brought** *pi*, *pp да* bring; прынесены
**brown** карычневы
**brush** шчотка; пэндзаль; чысціць /*шчоткаю*/
**brutal** брутальны, жорсткі
**bucket** вядро
**budget** бюджэт
**build** будаваць
**builder** будаўнік
**building** будынак; будаўніцтва, будаванне
**built** *pi*, *pp да* build; пабудаваны
**bulb** лямпачка; ***electric b***. электрычная лямпачка
**Bulgarian** балгарын; балгарскі
**bureau** бюро
**burn** паліць; гарэць; апячы
**burnt** *pi*, *pp да* burn; спалены
**bury** хаваць /*нябожчыка*/, закапаць /*рэч*/
**bus** аўтобус; ***b. stop*** аўтобусны

прыпынак; ***by b***. аўтобусам, на аўтобусе
**bush** куст, корч
**business** справа, бізьнес; дзелавы
**busy** заняты
**but** але; акрамя
**butter** масла
**butterfly** матылёк
**button** гузік, кнопка
**buy** купляць
**by** каля; да; *у залежным стане паказвае на аўтара дзеяння ці на сродак;* ***the book written by Maxim Garetski*** кніга, напісаная Максімам Гарэцкім

## C

**cabbage** капуста; капусны
**café** кавярня
**cage** клетка
**cake** торт, піражнае
**calculator** калькулятар
**calendar** каляндар
**calf** (*pl* calves) цяля; ***to be in c***. быць цельнай /*пра карову*/
**call** клікаць, зваць, называць; заходзіць; ***to c. out*** выклікаць; выгукнуць
**calm** спакойны; супакойваць; ***to c. down*** супакойвацца, сціхаць
**calmly** спакойна
**came** *pi да* come
**camel** вярблюд
**camera** фотаапарат
**camp** лагер, летнік, стан; ладзіць стан
**campaign** кампанія /*шэраг мерапрыемстваў*/
**camping**: ***to go c***. ісці ў паход з перанчаваннем
**can** I магчы; умець
**can** II палівачка
**can** III бляшанка; бляшанка кансерваў; кансерваваць
**Canadian** канадзец; канадзкі
**candy** цукерка
**cannot** = can't =can not
**canteen** страўня, буфет /*у школе, на прадпрыемстве*/
**canvas** палатно, карціна
**cap** шапка, вечка, накрыўка, каўпачок
**capable** здольны
**capital** сталіца; капітал; вялікая літара
**captain** капітан
**capture** захоп; захапіць
**car** легкавы аўтамабіль
**card** картка
**care** догляд, клопат; даглядаць, клапаціцца; ***to take c. of*** апекавацца, клапаціцца пра
**career** кар'ера; прафесія
**careful** акуратны, асцярожны, дбайны, клапатлівы
**carefully** асцярожна
**careless** неахайны, нядбайны, неакуратны
**carnation** гваздзік
**carpenter** сталяр
**carpet** дыван, кілім
**carriage** вагон; калёсы
**carrot** морква
**carry** несці; везці; утрымліваць; ***to c. on*** весці, працягваць; ***to c. out*** здзейсніць, ажыццявіць, праводзіць
**cartoon** мультфільм; карыкатура
**case** выпадак; чамадан
**cassette** касета; ***c.- recorder*** магнітафон
**castle** замак
**cat** кот
**catch** лавіць, хапаць; ***to c. cold*** прастудзіцца; ***to c. fish*** лавіць рыбу; ***to c. up*** даганяць
**cathedral** збор, сабор
**Catholic** каталік; каталіцкі
**cattle** жывёла, скаціна, гавяда
**cattle-raising** жывёлагадоўля буйнай рагатай жывёлы; жывёлагадоўчы
**caught** *pi*, *pp да* catch; злоўлены
**cause** прычына; справа; выклікаць, спрычыняць
**cave** пячора
**CD** кампакт-дыск; ***CD player*** прайгравальнік кампракт-дыскаў
**ceiling** столь
**celebrate** святкаваць, адзначаць
**celebration** святкаванне
**cellar** склеп

**cemetary** могілкі, клады
**centimetre** сантыметр
**central** цэнтральны; ***c. heating*** цэнтральнае ацяпленне
**centre** цэнтр, сярэдзіна
**century** стагоддзе
**ceramics** кераміка
**cereals** *pl* збожжа, збожжавыя культуры
**certain** упэўнены, пэўны, нейкі
**certainly** вядома, канечне
**chain** ланцуг; ***human c.*** ланцуг людзей, людскі ланцуг
**chair** крэсла
**chairman** старшыня
**chalk** крэйда
**champion** чэмпіён
**championship** чэмпіянат
**chance** выпадак; магчымасць, шанец; ***by c.*** выпадкова
**change** мяняць, змяняцца; перамена, змена; рэшта /*грошы*/; ***to c. one's mind*** перадумаць, памяняць сваё меркаванне
**chapel** капліца
**chapter** раздзел /*кнігі, гісторыі*/
**character** характар; герой, персанаж, дзейная асоба
**charm** прывабнасць, чароўнасць
**charming** чароўны
**chat** размова, гутарка; размаўляць, гутарыць
**cheap** танны
**cheat** падман; падманіць
**check** кантроль, праверка; правяраць
**cheek** шчака
**cheer up** падбадзёрваць
**cheerful** вясёлы, радасны
**cheese** сыр
**chemical** хімічны; ***c.s*** хімікаты, хімічныя рэчывы
**chemistry** хімія
**chemist's**; ***the c.*** аптэка
**cheque** чэк
**cherry** вішня
**chess** шахматы; шахматны
**chest** грудзі, грудная клетка; куфар
**chicken** кураня; /*мяса*/ курацiна, кура
**chief** галоўны, асноўны; начальнік
**child** (*pl* children) дзіця
**childhood** дзяцінства
**children** (*pl да*) child) дзеці
**chimney** комін
**chin** падбародак
**Chinese** кітаец; кітайскі
**chips** чыпсы, смажаная бульба
**chocolate** шакалад; шакаладны
**choice** выбар
**choir** хор /*група спевакоў*
**choose** выбіраць
**chose** *pi да* choose
**chosen** *pp да* choose; выбраны, абраны
**Christian** хрысціянскі
**Christmas** Каляды; калядны
**church** царква; царкоўны
**cinema** кінатэатр
**circle** круг, акружнасць
**circus** цырк
**citizen** грамадзянін
**city** горад /*буйны*/
**civil** цывільны
**civilization** цывілізацыя
**class** клас
**classical** класічны
**classmate** аднакласнік
**classroom** класны пакой
**claw** кіпцюр
**clean** чысты; чысціць; выціраць /*дошку*/
**clear** ясны; зразумелы; прыбіраць;
***to c. the table*** прыбіраць са стала
**clerk** службовец
**clever** разумны
**climate** клімат
**climatic** кліматычны
**climb** узлазіць, залазіць
**clock** гадзіннік; ***it's three o'clock*** тры гадзіны; ***at two o'clock*** у дзве гадзіны
**close** цесны, шчыльны; блізкі; ***c. to*** блізкі да; зачыняць, зачыняцца; загарнуць /*кнігу*/
**cloth** тканіна
**clothes** вопратка
**cloud** воблака, хмара
**clown** клоўн
**club** клуб; дубінка
**coach** трэнер
**coal** вугаль
**coast** узбярэжжа, бераг /*мора*/

**coastal** берагавы, прыбярэжны
**coat** паліто
**cock** певень
**coffee** кава; кававы
**coin** манета
**cold** холад, насмарк; халодны;
***to catch c***. прастудзіцца
**collar** каўнер
**collect** збіраць
**collection** калекцыя; збіранне, збор
**collective farm** калгас
**college** калеж
**colour** колер; ***what c. is/ are..?*** якога колеру..?
**column** калона; слупок
**comb** грэбень, расчоска; расчэсваць
**combine** спалучаць; ***c. harvester*** камбайн /*жняярка*/
**come** прыходзіць, прыязджаць; надыходзіць; ***to c. across*** знайсці, патрапіць, сустрэць; ***to c. back*** вяртацца; ***to c. down*** спускацца, сыходзіць; ***to c. in*** заходзіць, уваходзіць; ***to c. out*** выходзіць; ***to c. to one's place*** прыходзіць да *каго-н.*; ***to c. up*** падыходзіць
**comedy** камедыя
**comfort** камфорт, зручнасць
**comfortable** зручны
**commerce** гандаль
**committee** камітэт
**common** агульны, супольны; звычайны; просты; распаўсюджаны
**commonwealth** супольнасць, садружнасць
**communication** сувязь
**community** грамада, супольнасць
**company** кампанія, таварыства, гурт, трупа
**compare** параўнаць***; c.d with*** у параўнанні з
**comparison** параўнанне
**compartment** аддзяленне; купэ
**compete** спаборнічаць
**competition** спаборніцтва; конкурс; канкурэнцыя
**competitive** канкурэнтаздольны
**complain** жаліцца, скардзіцца
**complaint** скарга
**complete** поўны; скончаны; канчаць, завяршаць
**completely** цалкам, зусім
**complex** складаны
**compose** складаць /*твор*/
**composer** кампазітар
**compulsory** прымусовы; абавязковы /*пра навучанне, службу і пад.*/
**computer** кампутар; кампутарны
**concentrate** засяроджваць; збіраць, канцэнтраваць
**concern** клопат; закранаць
**concert** канцэрт
**conclude** канчаць, зачыняць, завяршаць
**conclusion** выснова
**condition** умова; стан
**conditional** умоўны
**conduct** праводзіць, весці
**conference** канферэнцыя
**confidence** давер
**confident** упэўнены
**confirm** пацвярджаць
**conflict** канфлікт, сутыкненне
**confuse** блытаць, бянтэжыць
**congratulate** віншаваць
**congratulation** віншаванне
**congress** з'езд, кангрэс; ***the C.*** Кангрэс /*парламент у ЗША*/
**connect** звязваць, злучаць
**conquer** заваяваць
**conquest** заваёва
**consent** згода
**consider** лічыць, меркаваць; разглядаць /*пытанне*/; ***to be considered to be*** + *noun* лічыцца *кім-н.*
**considerable** значны; вялікі
**consist of** складацца з
**constitution** канстытуцыя
**construction** будаўніцтва; канструкцыя
**consult** раіцца; кансультаваць
**comsume** есці, піць; спажываць
**consumer** спажывец
**contact** кантакт, дачыненне; кантактаваць
**contain** утрымліваць, змяшчаць
**contaminate** забруджваць
**contamination** забруджанне
**contemporary** сучасны
**content** задаволены; змесціва

**contest** спаборніцтва
**continent** кантынент
**continue** працягваць
**contradict** пярэчыць
**contrary** супрацiўны; супрацьлеглы; упарты, наравісты; ***c. to*** насуперак; ***on the c***. наадварот; ***to be c. to*** супярэчыць *чаму-н.,* працiвiцца
**contribute** ахвяраваць, рабiць унёсак, спрыяць, садзейнiчаць
**contribution** ахвяраванне, унёсак
**control** кантроль; кантраляваць
**convenient** зручны, выгодны
**conversation** размова, гутарка
**convince** пераконваць, запэўнiваць
**cook** кухар; варыць
**cooking** гатаванне ежы, кулiнарыя
**cool** прахалода; халаднаваты; студзiць; ***to c***., ***to c. down*** чахцi, студзiцца
**cooperate** супрацоўнiчаць
**cooperation** супрацоўнiцтва
**copy** копiя, асобнiк; капiяваць, перапiсваць
**copy-book** сшытак
**corn** збожжа, збажына
**corner** кут/ок, вугал
**correct** правiльны; выпраўляць
**correctly** правiльна
**correspond** адпавядаць
**corridor** калiдор
**cost** (*pi*, *pp да* cost) каштаваць, мець цану
**costume** касцюм /*жаночы,* тэатральны/
**cosy** утульны
**cotton** бавоўна; баваўняны
**cough** кашаль; кашляць
**could** *pi да* can
**couldn't** = could not
**council** рада; ***C. of Europe*** Рада Еўропы
**count** лiчыць, налiчыць
**country** краiна; сельскi, вясковы; ***in the c***. у вёсцы /*не ў горадзе*/; ***this c***. наша краiна; ***c. school*** вясковая школа
**countryside** мясцовасць за горадам, сельская мясцовасць; краявiд; сельскi, вясковы
**couple** пáра /*два прадметы, жанчына i мужчына*/
**courage** смеласць, мужнасць
**course** курс, накiрунак, хада; ***of c***. вядома!; ***c.s*** курсы
**court** суд
**cousin** стрыечны брат, стрыечная сястра
**cover** покрыва, накрыўка, вечка; накрываць, закрываць; асвятляць /*падзеi*/
**cow** карова
**craft** рамяство
**crash** грукат; крах; грукнуць, грымнуцца, разбiцца
**crazy** шалёны, вар'яцкi; ***to be c. about*** быць без памяцi ад
**create** ствараць
**creation** стварэнне
**creature** iстота, стварэнне
**credit** крэдыт
**crew** каманда, экiпаж
**crime** злачынства
**criminal** злачынец; злачынны
**crisis** крызiс
**critical** крытычны
**critisize** крытыкаваць
**crop** ураджай; пасевы
**cross** крыж; пераходзiць, пераплываць, перасякаць
**crossing** скрыжаванне; пераход
**crow** варона
**crowd** натоўп, тлум; тоўпiцца
**crowded** перапоўнены, тлумны
**crown** карона
**cruel** жорсткi
**cry** крык; плач; крычаць; плакаць
**cucumber** гурок
**cultural** культурны
**culture** культра
**cunning** хiтры
**cup** кубак, кубачак; спартыўны кубак
**cupboard** шафа
**cure** лячыць
**curious** цiкаўны, дапытлiвы; ***to be c***. + *inf* карцець
**current** плынь; ток; цяперашнi
**curtain** фiранка, штора
**custom** звычай, традыцыя
**customer** пакупнiк, клiент
**customs** мытня

**cut** (*pi*, *pp* cut) рэзаць, парэзаць, стрыгчы /*валасы*/; парэзаны; ***to c. off*** адрэзаць; ***to c. short*** перабіваць, абразаць /*размову*/
**cycle** ехаць веласіпедам/ на веласіпедзе
**cyclist** веласіпедыст

**D**

'd /*у скаротах*/ should, would; you'd = you would
**dad**, **daddy** тата, татка
**daily** штодня; штодзённы
**dairy** малочны; ***d. products*** малочныя прадукты
**damage** шкода, страта; па/шкодзіць, са/псаваць
**damp** вільготны, сыры
**dance** танец; скакаць, танчыць
**dancer** танцор/ка
**danger** небяспека
**dangerous** небяспечны
**Danish** датчанін; дацкі
**dare** адважыцца, асмеліцца
**dareing** смелы
**dark** цёмны
**darken** цямнець
**darkness** цемра
**date** дата; ***what's the d. today?*** якое сёння число?
**daughter** дачка
**dawn** досвітак
**day** дзень; ***all d***. увесь/ цэлы дзень; ***by d.*** удзень; ***one d***. аднойчы, неяк, калі-небудзь; ***what d. of the week is it?*** які сёння дзень?
**daytime**: ***by the d.*** удзень
**dead** мёртвы
**deaf** глухі
**deal** (with) мець справу з; ***a great d. of*** шмат, багата
**dear** дарагі /*чалавек, цана*/
**death** смерць; ***to put to d***. караць смерцю
**debt** доўг
**deceive** падманіць, ашукаць
**December** снежань
**decent** годны, прыстойны
**decide** вы/рашаць
**decision** рашэнне
**declare** заяўляць, абвяшчаць
**decorate** упрыгожыць, аздобіць
**decoration** упрыгожанне
**dedicate** прысвячаць
**deed** справа, учынак
**deep** глыбокі; глыбінёю; ***two metres d***. глыбінёю два метры
**deeply** глыбока
**deer** (*мн. л.* deer) алень
**defeat** параза; перамагаць, наносіць паразу
**defence** абарона
**defend** абараняць
**definite** пэўны
**definitely** дакладна, з пэўнасцю
**deforestation** знікненне/ высечка лясоў
**degree** ступень; градус
**delay** адкладаць
**delicate** далікатны
**delicious** смачны, цудоўны
**delight** захапленне; захапляць; ***to be d.ed*** быць у захапленні
**deliver** дастаўляць; перадаваць
**demand** патрэба; патрабаванне; патрабаваць
**democracy** дэмакратыя
**democratic** дэмакратычны
**dense** густы, шчыльны
**dentist** зубны лекар, зубнік
**deny** адмаўляць
**department** аддзел; аддзяленне; факультэт
**depend** залежаць
**dependent** залежны
**deposit** паклад, радовішча
**describe** апісваць
**description** апісанне
**desert** пустыня; пустэльны, пусты
**deserve** заслугоўваць
**design** праект; дызайн /*эстэтычнае афармленне*/; праектаваць, планаваць; канструяваць
**desire** жаданне; жадаць
**desk** пісьмовы стол; парта
**destiny** лёс
**destroy** разбураць
**destruction** разбурэнне, знішчэнне
**detail** дэталь; падрабязнасць; ***in d***. дэталёва, падрабязна
**detailed** дэталёвы, падрабязны

**detective** дэтэктыўны; дэтэктыў, следчы
**determination** рашучасць; вызначэнне
**determine** вызначаць
**develop** развіваць,
праяўляць /*фотастужку*/
**development** развіццё
**device** прылада
**devote** прысвячаць
**dialogue** дыялог
**diary** дзённік
**dictate** дыктаваць
**dictation** дыктоўка
**dictator** дыктатар
**dictatorship** дыктатура
**dictionary** слоўнік
**did** *pi да* do; *ужываецца як дапаможны дзеяслоў у пытальных і адмоўных сказах у часе Past Indefinite / Simple Past*
**didn't** = did not
**die** паміраць
**diet** дыета
**differ** адрозніваццa; разыходзіцца
**difference** розніца
**different** розны, адрозны, іншы
**difficult** цяжкі
**difficulty** цяжкасць; ***to run into d.lties*** сутыкнуцца з цяжкасцямі
**dig** капаць
**dignity** годнасць
**dinner** абед; ***to have d***. абедаць
**direct** прамы; просты /*мова*/; накіроўваць
**direction** накірунак, напрамак
**directly** прама, непасрэдна
**dirty** брудны
**disagree** не пагаджацца, пярэчыць
**disappear** знікаць
**disappoint** расчароўваць
**disaster** бяда, няшчасце, катаклізм
**discourage** адгаварыць, перашкаджаць, не даваць
**discover** адкрываць; даведацца
**discovery** адкрыццё
**discuss** абмяркоўваць
**discussion** абмеркаванне, дыскусія
**disease** хвароба
**dish** страва; талерка /*вялікая*/
**dishwasher** пасудамыйная машына
**display** экспазіцыя; паказ, дэманстрацыя; выстаўляць, дэманстраваць
**dispute** спрэчка
**distance** адлегласць
**distinct** ясны, выразны
**district** акруга, раён
**disturb** непакоіць, турбаваць
**dive** ныраць
**divide** падзяляць, дзяліць
**do** рабіць, зрабіць; пісаць, прыбіраць, абыходзіцца (*выступае як заменнік многіх дзеясловаў з агульным значэннем* "займацца чым-н., рабіць што-н."); *дапаможны дзеяслоў для пытальных і адмоўных сказаў у* Present Indefinite; *у 3 а. адз. л. мае форму* does; *у адмоўных сказах мае форму* don't, doesn't; *у часе* Past Indefinite/ Simple Past *мае форму* did, didn't
**doctor** лекар, доктар
**document** дакумент
**documentary** дакументальны фільм
**does** *3 а. адз. л. да* do
**doesn't** =does not
**dog** сабака
**doll** лялька; лялечны
**dollar** даляр
**domestic** хатні; свойскі /*пра жывёлу*/; нутраны, нацыянальны
**done** *pp да* do; зроблены
**donkey** асёл
**don't** = do not
**door** дзверы
**dot** кропка; крапінка
**double** падвойны; падвойваць
**doubt** сумненне; сумнявацца
**doubtful** сумнеўны
**down** уніз; унізе
**downstairs** унізе; уніз; ***to go/ come d.*** сыйсці /спусціцца ўніз
**dozen** тузін, *звычайна перакладаецца як* дзесятак
**drama** драма
**dramatic** драматычны; уражвальны
**drank** *pi да* drink
**draw** I нічыя; ***in a d***. унічыю
**draw** II маляваць; цягнуць; выймаць, выцягваць
**drawback** недахоп, загана

**drawer** шуфляда
**drawing** маляванне; малюнак
**drawn** *pp да* draw
**dream** мара; сненне; марыць, сніць
**dress** вопратка; апранацца
**drew** *pi да* draw
**drink** піць; напой
**drive** гнаць; кіраваць, весці машыну; забіваць /*цвік*/
**driven** *pp да* drive
**driver** шафёр
**drop** кропля; выпусціць /*з рук*/; спыняць
**drought** засуха
**drove** *pi да* drive
**drown** тануць; тапіць/*у вадзе*/
**drug** лекі, наркотык
**drunk** *pp да* drink; п'яны
**dry** сухі; сушыць; выціраць
**duck** качка
**due** належны; ***d. to*** дзякуючы *чаму-н.*, у выніку
**dull** нудны, нецікавы; тупы /*чалавек*/
**dumb** нямы
**during** у час, цягам
**dust** пыл; выціраць пыл
**duster** анучка
**Dutch** нідэрландзкі, галандзкі
**duty** абавязак; падатак, мыта, пошліна; ***to be on d***. дзяжурыць; ***d. free*** бязмытны; ***to be d*. *free*** не абкладацца мытам
**dwell** жыць /*дзе-н.*/
**dwelling** жытло
**dye** фарбаваць

## E

**each** кожны; ***e. other*** адзін аднаго
**eager** які імкнецца, які прагне; ***to be e***. прагнуць
**eagle** арол
**ear** вуха
**early** рана
**earn** зарабляць; ***to e. money*** зарабляць грошы
**earnest** сур'ёзны
**earring** завушніца
**earth** зямля; зямны шар
**easily** лёгка
**east** усход
**eastern** усходні
**easy** лёгкі; лёгка
**eat** есці; ***to e. up*** з'есці
**eaten** *pp да* eat; з'едзены
**ecological** экалагічны
**ecology** экалогія
**economic, economical** эканамічны
**economist** эканаміст
**economy** гаспадарка, эканоміка; ашчаднасць
**edge** край, канец
**edifice** будынак
**edit** выдаваць /*кнігу, газету*/
**educated** адукаваны; выхаваны
**educate** даваць адукацыю; выхоўваць
**education** адукацыя
**effect** вынік, наступства
**effort** намаганне, спроба
**egg** яйка; ***to lay e.s*** несці яйкі
**Egyptian** егіпцянін; егіпецкі
**eight** восем
**eighteen** васемнаццаць
**eighty** восемдзесят
**either** любы; таксама не; ***e***... ***or***... ці... ці.., або... або...
**elk** лось
**elder** старэйшы /*з дзяцей сям'і*/
**eldest** самы старэйшы
**elect** абіраць, выбіраць
**election** выбары
**electric, electrical** электрычны
**electricity** электрычнасць, электрыка
**elephant** слон
**eleven** адзінаццаць
**else** яшчэ; іншы; болей /*у адмоўных сказах*/
**elsewhere** у іншым месцы
**e-mail** электронная пошта; перасылаць па электроннай пошце
**embassy** амбасада, пасольства
**emerge** з'яўляцца, паказвацца, узнікаць
**emphasis** важнасць, значнасць, увага; ***to place a great*/ *heavy e. on*** надаваць вялікую значнасць *чаму-н.*
**empire** імперыя
**employ** наймаць
**employee** работнік, службовец
**employer** працадаўца, наймальнік

**employment** ужыванне; найм; занятак, праца
**empty** пусты, нішчымны
**encourage** заахвочваць; натхняць
**end** канец; канчаць, канчацца
**enemy** вораг; варожы
**energy** энергія
**engage** займацца, быць занятым
**enganged** заняты; заручоны/я/ /*пра жаніха, нявесту*/; ***not engaged*** вольны, незаняты
**engine** рухавік
**engineer** інжынер
**English** англічанін; англійская мова; англійскі
**enjoy** цешыцца, падабацца; карыстацца, мець
**enjoyable** прыемны
**enough** даволі, дастаткова
**ensure** забяспечваць, гарантаваць
**enter** заходзіць; паступаць /*у навучальную ўстанову*/
**enterprise** прадпрыемства
**entertain** забаўляць, займаць; частаваць
**entertainment** забаўка, задавальненне
**entire** увесь, цэлы
**entrance** уваход
**envelope** капэрта, канверт
**environment** навакольнае асяроддзе
**envy** зайздрасць; зайздросціць
**equal** роўны, аднолькавы
**equality** роўнасць
**equip** аснашчаць
**equipment** аснашчэнне, абсталяванне, рыштунак
**eraser** сціркa
**erect** узводзіць
**error** памылка
**escape** уцёкі; уцякаць
**especially** асабліва
**essay** нарыс; эсе; твор
**essential** асноўны
**establish** устанавіць, заснаваць
**establishment** установа
**Estonian** эстонец; эстонскі
**etc** і г.д., і гэтак далей
**eternal** вечны
**European** еўрапеец; еўрапейскі
**eve** пярэдадзень; ***on the e. of*** напярэдадні
**even** нават
**evening** вечар; ***good e.!*** добры вечар!; ***in the e.*** увечары
**event** падзея; спаборніцтва /*у пэўным відзе спорту*/
**ever** калі-небудзь; заўсёды; /*у адмоўных сказах*/ ніколі
**every** кожны
**everybody** усе, кожны
**everyone** усе
**everything** усё
**everywhere** усюды
**evidence** відавочнасць; сведчанне, доказ
**evident** відавочны
**evil** ліха; ліхі, злавесны
**evolution** эвалюцыя, развіццё
**exact** дакладны
**exactly** дакладна, менавіта так
**exam**, **examination** экзамен
**examine** экзаменаваць; абследаваць
**example** узор, прыклад; ***for e.*** дапрыкладу
**exceed** перавышаць
**excellent** цудоўны
**except** акрамя, апроч
**excepting** за выняткам, выключаючы
**exceptionally** асабліва
**exchange** абмен; мяняцца /*чым-н.*/; ***in e. for*** узамен за/на
**excite** хваляваць
**excited** усхваляваны; ***to be e.*** хвалявацца
**exitement** хваляванне
**exciting** хвалюючы, захапляльны
**exclaim** усклікнуць
**excursion** экскурсія
**excuse** прабачэнне; адгаворка; даравaць; прасіць прабачэння; ***e. me*** даруй/це
**executive** выканаўчы /*пра ўладу*/
**exercise** практыкаванне; практыкавацца, ажыццяўляць; ***e. book*** сшытак
**exhibit** экспанат; праяўляць; выстаўляць
**exhibition** выстава
**exile** высылка, выгнанне
**exist** існаваць
**existence** існаванне
**exit** выхад

**expect** чакаць, меркаваць
**expense** трата; ***e.s*** выдаткі
**expensive** дарагі /*цаною*/
**expedition** экспедыцыя
**experience** досвед
**experienced** дасведчаны, абазнаны
**experiment** дослед, эксперымент
**explain** тлумачыць
**explanation** тлумачэнне
**explode** выбухнуць
**exploit** подзвіг
**exploration** даследванне
**explore** даследваць, вывучаць
**explorer** даследчык
**explosion** выбух
**export** экспарт; экспартаваць
**expose** выкрываць; выстаўляць /*тавары*/
**express** тэрміновы; выражаць; ***e. train*** хуткі цягнік
**expression** выраз, выказванне
**extend** пашыраць, распаўсюджваць
**extensive** буйны; экстэнсіўны
**extinct** патухлы /*вулкан*/; вымерлы, зніклы /*жывёліна*/; ***to become e***. выміраць
**extinction** выміранне, знікненне
**extra** дадатковы
**extract** урывак
**extraordinary** надзвычайны
**extreme** крайні
**eye** вока
**eyebrow** брыво
**eyelash** павейка

## F

**face** твар; сутыкацца, стаяць /*перад праблемай*/, супрацiўляцца
**fact** факт; ***in f***. фактычна
**factory** завод, фабрыка; заводскі, фабрычны
**fail** не ўдацца; правалiцца /*на экзамене*/; нехапаць, бракаваць; ***to f. to do*** *smth* не здолець *зрабіць штосьці*
**failure** няўдача, правал
**faint** слабы; страціць прытомнасць
**fair** кірмаш; бялявы, светлы; чэсны, справядлівы
**faith** вера
**faithful** верны, адданы
**fake** падробка; фальшывы, падробны; падрабляць, фальшаваць
**fall** падзенне; падаць; ***to f. ill*** захварэць
**fallen** *pp да* fall
**false** фальшывы, ілжывы
**fame** слава
**familiar** знаёмы, вядомы
**family** сям’я
**famous** славуты, слынны; ***to be f. for*** слыць, мець славу
**fan** паклоннік, заўзятар
**fantastic** фантастычны
**fantasy** фантазія, уяўленне
**far** далёкі; далёка; ***f. away*** далёка; ***by f***. значна; ***as f. as I know*** наколькі мне вядома
**fare** плата за праезд
**farm** ферма; абрабляць /*зямлю*/; ***collective f***. калгас
**farmer** фермер, селянін
**farming** сельская гаспадарка,земляробства
**farther** далей
**fascinate** зачараваць
**fashion** мода
**fast** моцны; хуткі; хутка, шпарка
**fasten** звязаць, завязаць; прымацаваць; заплікнуць
**fat** тлушч; тлусты; тоўсты
**father** бацька
**fault** памылка; загана, недахоп; віна
**favour** паслуга; спрыянне; спрыяць; ***in f. of*** на *чыю-н*. карысць
**favourable** спрыяльны
**favourite** любімы
**fear** страх; баяцца
**feast** свята
**feature** рыса, асаблівасць; фігураваць
**February** люты
**fed** *pi*, *pp да* feed; накормлены
**federal** федэральны
**feed** карміць
**feel** адчуваць; ***to f. oneself*** пачувацца; ***to f. fine*/ *bad*/ *unwell*** адчуваць сябе добра/ нядобра/ што захварэў
**feeling** адчуванне, пачуццё
**feet** ногі
**fell** *pi да* fall
**fellow** хлопец, дзяцюк

**felt** *pi*, *pp да* feel
**felt-tip pen** фламастэр
**fence** плот
**festival** свята; фестываль
**festive** святочны
**few** мала, небагата, няшмат /*пры злічоных назоўніках*/; ***a f.*** некалькі /*са злічонымі назоўнікамі*/
**fiction** выдумка
**fiddle** скрыпка
**field** поле
**fierce** бязлітасны, люты
**fifteen** пятнаццаць
**fifth** пяты
**fifty** пяцьдзесят
**fight** бойка; змагацца; біцца
**figure** лічба; постаць, фігура; малюнак
**fill** напоўніць
**film** фільм; фотастужка
**final** фінал; апошні, заключны
**finally** урэшце, нарэшце
**financial** фінансавы
**find** знайсці; ***to f. out*** даведацца
**fine** добры; тонкі; штраф; штрафаваць
**finger** палец
**finish** канец; фініш; канчаць
**Finnish** фін; фінскі
**fire** агонь; пажар; вогнішча, цяпельца; звольніць, выгнаць /*з працы*/
**fire-fighter**, **fireman** пажарнік
**fireplace** камін
**firm** цвёрды, непахісны; фірма
**first** першы; спярша; ***f. aid*** першая дапамога; ***f. name*** імя; ***at f***. спярша
**firstly** па-першае
**fish** рыба; рыбны; лавіць/ вудзіць рыбу
**fishing** рыбалоўства; ***f. rod*** вуда
**fit** прыдатны; рыхтаваць, адпавядаць
**five** пяць
**fix** прымацаваць, усталяваць; рапараваць, рамантаваць
**fizzy** шыпучы, газаваны
**flag** сцяг
**flame** полымя
**flat** I кватэра
**flat** II пляскаты, роўны
**flax** лён
**fled** *pi*, *pp да* flee
**flee** уцякаць /*з краіны, гораду*/
**fleet** флот
**flew** *pi да* fly
**flight** палёт
**flood** паводка
**floor** паверх; падлога
**flour** мукá
**flow** цячы
**flower** кветка
**flown** *pp да* fly
**flu** грып
**fly** муха; ляцець
**fog** туман
**folk** народ, людзі; народны
**folklore** фальклор
**follow** ісці следам/ ўслед, ісці за /*кім-н.*/; сачыць; рабіць тое ж/ гэтаксама, выконваць /*інструкцыі, правілы*/
**following** наступны
**fond** які любіць, пяшчотны; ***to be f. of*** любіць *што-н.*
**food** ежа
**fool** дурань; блазан; дурыць, падманваць
**foolish** дурны
**foot** (*pl* feet) нага; падэшва /*гары*/; ***on f.*** пешшу, пешкі
**football** футбол
**for** для, на; за; на працягу; у той час як; бо, таму што; ***f. breakfast*** на снеданне
**forbade** *pi да* forbid
**forbid** забараняць
**forbidden** *pp да* forbid; забаронены
**force** сіла, моц; змушаць, прымушаць
**forehead** лоб
**foreign** замежны
**foreigner** іншаземец
**forest** лес
**forever** назаўсёды, назаўжды
**forgave** *pi да* forgive
**forget** забыць
**forgive** дараваць
**forgiven** *pp да* forgive
**forgot** *pi да* forget
**forgotten** *pp да* forget; забыты
**fork** відэлец
**form** форма; клас; ствараць, утвараць
**formal** афіцыйны
**formation** фармаванне, будова, структура

**former** былы, ранейшы
**fortnight** два тыдні, паўмесяца
**fortress** цвярдыня, крэпасць
**fortunately** нашчасце
**fortune** лёс; багацце
**forty** сорак
**forward** наперад; ***to put f.*** прапанаваць, вылучыць
**fought** *pi*, *pp да* fight
**found** I заснаваць, стварыць
**found** II *pi*, *pp да* find; знойдзены; ***to be f.*** вадзіцца /*пра жывёл*/
**founder** заснавальнік
**fountain** фантан
**four** чатыры
**fourteen** чатырнаццаць
**fox** ліса
**fraction** доля, дроб
**free** вольны, свабодны; бясплатны; вызваляць
**freedom** воля, свабода
**freeze** замярзаць; заморожваць
**French** француз; французкі
**frequent** часты
**fresh** свежы
**Friday** пятніца
**fridge** лядоўня
**friend** сябар
**friendly** сяброўскі
**friendship** сяброўства, дружба
**frighten** палохаць, пужаць; ***to be f.ed*** палохацца
**frog** жаба
**from** з, ад; ***f. under*** з-пад
**front** фронт; пярэдні; ***in f. of*** перад, паперадзе
**frost** мароз
**frosty** марозны, сцюдзёны
**froze** *pi да* freeze
**frozen** *pp да* freeze; замерзлы, замарожаны
**fruit** фрукт, плод; ***f.s*** садавіна; плён
**fruitful** плённы
**fry** смажыць
**fuel** паліва
**fulfill** выканаць, здзейсніць, ажыццявіць
**full** поўны
**fume** дым
**fun**: ***to have a lot of f.*** добра бавіць час, добра павесяліцца; ***to make fun of*** пасмяяцца з
**fund** фонд
**funeral** паховіны
**funny** вясёлы, пацешны
**fur** футра, поўсьць
**furious** раз'юшаны
**furniture** мэбля
**fur-tree** яліна, елка
**further** далёкі; наступны, далейшы; далей; спрыяць, садзейнічаць
**furthermore** далей
**fury** ярасць
**future** будучыня; будучы

## G

**gain** прыбытак, выгода; зарабіць; атрымаць
**gallery** галерэя
**game** гульня; ***to play g.s*** гуляць /*пра дзяцей*/
**gap** прамежак; пропуск, прабел, прагал; разрыў, розніца /*у разьвіцці і пад.*/; ***to bridge the gap*** ліквідаваць разрыў
**garage** гараж
**garden** сад
**gas** газ; ***tear g.*** слезацечны газ
**gate** вароты
**gather** збіраць
**gathering** сход, сустрэча; мітынг
**gave** *pi да* give
**gay** вясёлы
**geese** *pl да* goose
**general** генерал; агульны, усеагульны; ***in g.*** увогуле
**generally** увогуле, наагул
**generation** пакаленне
**generous** шчодры
**genius** геній
**gentelman** джэнтлмен, шляхціц
**gentle** пяшчотны, далікатны
**geography** геаграфія
**geometry** геаметрыя
**German** немец; нямецкі
**gerund** герунд/ый
**get** атрымаць; паехаць, дабрацца; рабіцца; ***to g. off*** вылазіць, выходзіць /*з*

*транспарту/*; ***to g. on*** сядаць /*у транспарт*/; ***to g. out*** выбірацца прэч; ***to g. to*** дабірацца; ***to g. rid of*** вызваліцца ад, пазбаўляцца; ***to g. together*** збірацца; ***to g. up*** уставаць /*ад сну*/; ***to g***. + *прыметнік* рабіцца *якім-н*.; ***to g. tired*** стамляцца
**ghost** здань, прывід
**giant** волат, гігант; гіганцкі
**gift** падарунак
**girl** дзяўчына, дзяўчынка
**give** даць, перадаць; ***to g. back*** аддаць; ***to g. up*** пакідаць, кінуць; здацца, капітуляваць
**given** *pp да* give; дадзены
**glad** рады, задаволены; ***to be g***. радавацца
**glass** шкло; шклянка; шкляны; ***g.es*** акуляры; ***window g***. шыба
**global** сусветны; глабальны, усеагульны
**globe** шар; зямны шар
**gloomy** змрочны
**glory** слава
**glove** пальчатка
**glue** клей; клеіць
**go** ісці, пайсці; ***to go away*** пайсці; ***to go*** back вярнуцца; ***to go by bus/ by train*** ехаць аўтобусам/ цягніком; ***to go to bed*** класціся спаць; ***to go to the country*** ехаць у вёску; ***to go in*** заходзіць; ***to go down*** спускацца, садзіцца, заходзіць /*пра Сонца і пад.*/; ***to go out*** выйсці; ***to go up*** узрастаць, уздымацца, павелічацца; ***to go in for*** + *gerund* захапляцца, займацца *чым-н*.; ***to go home*** ісці дахаты; ***to go on*** працягваць; ***to be going to*** + inf збірацца *зрабіць што-н.; выражае таксама найбліжэйшы будучы час*
**goal** мэта; гол
**goalkeeper** брамкар, голкіпер
**goat** каза
**God** Бог
**gold** золата
**golden** залаты
**gone** *pp да* go
**good** дабро; добры; ***g.s*** тавары; ***good-bye*** бывай/це; ***to be g. at*** быць здольным да
**good-looking** прыгожы, сімпатычны
**goose** (*pl* geese) гусь
**got** *pi*, *pp да* get
**govern** кіраваць
**government** урад; урадавы
**governor** губернатар
**grade** адзнака; ступень
**gradually** паступова, пакрысе
**graduate** скончыць школу
**grain** хлеб, збожжа
**grammar** граматыка; граматычны
**gramme** грам
**grandchild** (*pl* grandchildren) унук, унучка
**granddaughter** унучка
**grandfather** дзед
**grandmother** баба
**grandparents** дзед і баба
**grandson** унук
**grant** стыпендыя; грант /*грошы*, *дадзеныя на якія-н. мэты*/; прадастаўляць, даваць
**grape** (*звыч. pl* grapes) вінаград /*ягады*/
**grapefruit** грэйпфрут
**grass** трава
**grasshopper** конік /*кузурка*/
**grateful** удзячны
**gratitude** удзячнасць
**great** вялікі; цудоўна, выдатна
**greatly** надта, вельмі, дужа
**greed** прагнасць
**greedy** прагны, сквапны
**Greek** грэк; грэцкі
**green** зялёны
**greet** вітаць
**greeting** пры/вітанне
**grew** *pi да* grow
**grey** шэры
**ground** зямля, глеба; месца, пляц; падстава; ***g. floor*** першы паверх; ***sports g***. спартыўная пляцоўка
**group** гурт, група
**grow** расці; вырошчваць; станавіцца /*якім-н.*/; ***to g. up*** вы/расці /*пра дзяцей*/
**grown** *pp да* grow; вырашчаны
**grown-up** дарослы
**growth** рост, прырост
**guard** вартавы; ахова, варта; ахоўваць
**guess** адгадаць, здагадацца; меркаваць
**guest** госць
**guide** экскурсавод, гід; весці
**guilty** вінаваты; ***to be g. of*** быць вінаватым у; ***to be found g. of*** быць прызнаным вінаватым у

**guitar** гітара
**gulf** затока
**gun** ружжо, рэвальвер, гармата, зброя; ***to g. down*** застрэліць
**guy** хлопец, дзяцюк
**gymnasium** спартыўная зала
**gymnastics** гімнастыка

### H

**habit** звычай, прывычка
**had** *pi*, *pp да* have
**hadn't** = had not
**hair** валасы
**hairdresser** цырульнік /*дамскі*/
**hairstyle** фрызура
**half** палова; ***it's h. past two*** палова трэцяй гадзіны
**hall** зала
**hall-stand** вешалка
**ham** вяндліна
**hamburger** гамбургер
**hammer** малаток
**hand** рука; стрэлка; ***to h. down*** перадаваць /*у спадчыну*/; ***to h. in*** уручаць; ***on the one h.... on the other h.*** з аднаго боку... з другога боку
**handbag** дамская торбачка
**handful** жменя; жменька
**handkerchief** хусцінка, насоўка
**handle** ручка; абыходзіцца
**handsome** прыгожы
**hang** вісець; вешаць
**happen** здарацца
**happiness** шчасце
**happy** шчаслівы; удалы, паспяховы
**harbour** гавань, порт
**hard** цвёрды; моцны; цяжкі; цяжка; старанна, настойліва; ***to work h.*** настойліва/ упарта працаваць
**hardly** ледзь, з цяжкасцю; наўрад ці; амаль не
**hardship** цяжкасць
**hare** заяц
**harm** шкода, страта; шкодзіць, наносіць шкоду
**harmful** шкодны
**harmless** бяскрыўдны
**harvest** ураджай; збіраць ураджай
**has** 3 *а. адз. л. да* have
**hasn't** = has not
**hat** капялюш
**hate** ненавідзець; ***to come to h.*** узненавідзець
**hatred** нянавісць
**have** мець; есці; ***to h. on*** быць апранутым у; ***to h. to*** + *inf* /*замяняе дзеяслоў* must *ва ўсіх часах*/ павінен, мусіць; ***he has to leave*** яму трэба ехаць; ***to h. got*** мець (*не ўжываецца ў м. ч.; адмоўн. ф.* I don't have got / I haven't got ); ***to h. a nice time*** добра бавіць час
**haven't** =have not
**hay** сена; ***to mow h***. касіць сена /*касою, касілкаю*/; ***to make h***. касіць сена /*нарыхтоўваць*/
**he** ён /*пра чалавека*/
**head** галава; узначальваць; ***at the h. of*** на чале *чаго-н.*
**headache** галаўны боль
**headline** загаловак
**headmaster** дырэктар школы
**headmistress** дырэктарка школы
**headquarters** сядзіба, цэнтр, управа
**heal** лячыць; гаіцца
**health** здароўе
**healthy** дужы, здаровы
**hear** чуць
**heard** *pi*, *pp да* hear
**heart** сэрца; цэнтр; ***by h***. напамяць
**heat** цяпло, спёка; грэць
**heating** ацяпленне
**heavy** цяжкі; ***h. snowfalls*** моцныя снегапады
**hedgehog** вожык
**heel** пята
**height** вышыня
**held** *pi*, *pp да* hold
**helicopter** верталёт
**hell** пекла, апраметная
**hello** прывітанне; добры дзень!
**help** дапамога; дапамагаць; ***to h. oneself to*** частавацца *чым-н.*
**helpful** карысны; паслужлівы
**helpless** бездапаможны

**hemisphere** паўшар'е
**hen** кура
**her** яе; ейны, свой/ свае
**hers** ейны, свой
**here** тут; сюды; ***h. is/ are*** вось; ***h. you are*** вось!, калі ласка!
**hero** герой
**herself** сябе, сабою; сама
**hesitate** вагацца
**hi** прывітанне
**hid** *pi да* hide
**hidden** *pp да* hide; схаваны
**hide** хованка; хаваць, хавацца
**high** высокі; высока; вышынёю; ***h. school*** сярэдняя школа; ***to be three metres h.*** быць вышынёю 3 метры
**highway** шаша, аўтастрада
**hiking** пешая вандроўка
**hill** пагорак, узгорак
**hilly** пагоркавы
**him** яму; яго /*він. склон*/
**himself** сябе; сам
**hire** найм; наняць, узяць напракат; ***to get hired*** паступіць/ уладкавацца на працу
**his** ягоны, свой/ свае
**historic** гістарычны
**historical** гістарычны
**history** гісторыя
**hit** (*pi*, *pp* hit) удар; шлягер; ударыць
**hobby** любімы занятак, хобі
**hockey** хакей
**hold** трымаць; змяшчаць; арганізаваць, праводзіць; ***to h. up*** падтрымліваць; трымацца
**hole** дзірка, адтуліна; нара; ямка
**holiday** свята; ***h.s*** канікулы
**hollow** дупло; пусты
**home** дом, жытло; дадому, дамоў; ***at h.*** дома
**homework** хатняе заданне
**honest** чэсны
**honey** мёд
**honour** гонар; ***in h. of*** у гонар; шанаваць, ушаноўваць
**honourable** ганаровы
**hook** крук, кручок
**hope** спадзяванне; спадзявацца
**horn** рог
**horrible** жахлівы
**horror** жах
**horse** конь
**hospital** шпіталь
**hostile** варожы, непрыязны
**hot** гарачы, спякотны
**hotel** гасьцініца, гатэль
**hour** гадзіна; ***at three h.s*** у тры гадзіны
**house** дом, будынак; хата; хатні; змяшчаць, даваць прытулак; ***the H. of Commons*** Палата грамадаў /*у Вялікай Брытаніі*/; ***the H. of Representatives*** Палата прадстаўнікоў /*у ЗША*/
**housewife** (*pl* housewives) хатняя гаспадыня
**how** як, якім чынам; ***h. long*** колькі часу, як доўга; ***h. much/ many?*** колькі?; ***this is h.*** вось як; ***h. do you do?*** Добры дзень!
**however** аднак, тым не менш
**huge** велізарны, каласальны
**human** чалавек; чалавечы, людскі; ***h. being*** чалавек; ***h.s*** людзі
**humorous** гумарыстычны
**humour** гумар
**hundred** сто
**hung** *pi*, *pp да* hang
**Hungarian** угорац; угорскі
**hunger** голад
**hungry** галодны
**hunt** паляваць
**hunter** паляўнічы
**hunting** паляванне
**hurricane** ураган
**hurry** паспешлівасць; спяшацца, хапацца; ***to h. up*** спяшацца; ***in a h.*** таропка, паспешліва; ***to be in a h.*** спяшацца
**hurt** ударыць; уразіць /*балючае месца*/; шкодзіць, нанесці шкоду; крыўдзіць
**husband** муж
**hut** хаціна

**I**

**I** я; I'd = I should/ would
**ice** лёд
**ice-cream** марозіва
**icy** ледзяны, сцюдзёны
**idea** ідэя

**ideal** ідэал; ідэальны
**identical** аднолькавы, ідэнтычны
**identify** атаесамляць; апазнаваць
**identity** ідэнтычнасць, тоеснасць
**idle** гуляшчы, незаняты
**if** калі /*злучнік*/; ці /*ва ўскосных пытаннях*/; ***I asked if he was at home*** я спытаў, ці дома ён; ***as if*** як бы, як быццам
**ignore** не ведаць; не зважаць, ігнараваць
**I'll** =I shall, I will
**ill** хворы, нядужы; кепска, пагана
**illegal** незаконны, супрацьзаконны
**illness** хвароба
**image** выява
**imaginary** уяўны
**imagination** уяўленне
**imagine** уяўляць
**imitate** пераймаць
**immediate** неадкладны, тэрміновы, пільны
**immediately** неадкладна, тэрмінова
**immense** гіганцкі, бязмежны
**immigrant** іміграцт
**immortal** неўміручы
**immortality** неўміручасць
**impatient** нецярплівы
**import** імпарт, увоз; імпартаваць, увозіць
**importance** важнасць
**important** важны
**impose** ускладаць; навязваць
**impossible** немагчымы
**impress** уражваць, моцна здзіўляць
**impression** уражанне
**improve** паляпшаць, дасканаліць
**improvement** паляпшэнне, удасканаленне
**in** у, на; праз, цераз; ***in front of*** перад, паперадзе; ***in an hour*** праз гадзіну; ***in the street*** на вуліцы; ***to be in*** знаходзіцца дома
**inactive** бяздзейны, неактыўны
**inaugurate** урачыста адкрываць
**inch** цаля /*мера даўжыні роўная 2,54 см*/
**incident** інцыдэнт
**incline** схіляцца
**include** уключаць
**including** уключна, уключаючы
**income** даход
**increase** павялічыць, павелічацца
**increasingly** усё болей
**indeed** сапраўды
**indefinite** няпэўны, неазначальны
**independence** незалежнасць
**independent** незалежны
**Indian** індыец, індус; індыйскі
**indirectly** ускосна
**individual** асоба, індывідуум; індывідуальны
**indoor** пакаёвы, закрыты
**indoors** дома, у памяшканні
**industrial** прамысловы
**industry** прамысловасць
**inevitable** непазбежны
**infinite** бясконцы
**influence** уплыў; уплываць, уздзейнічаць
**inform** інфармаваць
**informal** неафіцыйны
**information** інфармацыя, звесткі
**inhabit** насяляць
**inhabitant** жыхар, насельнік
**initial** пачатковы
**injection** ін'екцыя, укол
**ink** чарніла
**inner** нутраны
**innocent** невінаваты; бяскрыўдны
**inscription** надпіс
**insect** кузурка
**insert** устаўляць, укладаць
**inside** унутры, унутр
**insist** настойваць; сцвярджаць
**instance**: ***for i***. дапрыкладу
**instant** імгненне; імгненны
**instead** замест, узамен; /*у канцы сказа-пры прапанове нечага іншага*/ лепей; ***let's go to the cinema i***. давай лепей сходзім у кіно; ***i. of*** замест *чаго- н.*
**institution** установа
**instrument** прылада, інструмент /*і музычны*/
**insult** абраза, знявага; абражаць, зневажаць
**insurance** страхаванне, страхоўка
**intelligent** разумны
**intend** збірацца, наважвацца
**intensification** узмацненне, інтэнсіфікацыя
**intensify** узмацняць

**intent** спроба
**interest** цікавасць; цікавіць, зацікавіць; ***to be i.ed in*** цікавіцца *чым-н.*
**interesting** цікавы
**interior** нутраны
**international** міжнародны
**Internet** Інтэрнэт
**interrupt** перабіваць, перарываць
**interval** перапынак; антракт
**interview** інтэрвію; браць інтэрвію
**into** у, унутр
**introduce** прадстаўляць, знаёміць; уводзіць
**invent** вынаходзіць
**investigate** даследваць
**invitation** запросіны, запрашэнне
**invite** запрашаць
**involve** уцягваць, умешваць
**Irish** ірландзец; ірландзкі
**iron** жалеза; прас; жалезны; прасаваць
**irregular** няправільны, нестандартны
**irresponsible** безадказны
**is** *3 а. адз. л present indefinite дзеяслова* to be
**island** востраў
**isle** востраў
**isn't** = is not
**issue** прадмет, тэма
**it** яно; ён, яна; гэта; *фармальны дзейнік у безасабовых сказах*: ***it rains*** ідзе дождж; ***it's there that he*** + *verb* менавіта там/ менавіта ён + *дзеяслоў*
**Italian** італьянец; італьянскі
**its** ягоны, свой/ свае
**itself** сябе; само, сам, сама
**it's** = it is
**itself** само

## J

**jacket** пінжак; куртка
**jail** турма
**jam** варэнне
**January** студзень
**Japanese** японец; японскі
**jar** слоік, збан
**jaw** сківіца
**jazz** джаз
**jealous** раўнівы; зайздросны, крыватлівы
**jeans** джынсы
**jet** струмень; рэактыўны
**jewel** каштоўнасць; каштоўны камень
**job** праца; пасада; ***part-time j.*** няпоўны працоўны дзень, праца на паўстаўкі
**jobless** беспрацоўны
**jogging** бег трушком
**join** далучаць, далучацца, уступаць
**joke** жарт, досціп; жартаваць
**jolly** вясёлы; ***J. Roger*** вясёлы Роджэр /*пірацкі сцяг -чорнае палатно з выяваю чэрапа і скрыжаваных костак;у сапраўднасці ніколі не існаваў*/
**journal** часопіс (*навуковы*)
**journalist** журналіст
**journey** падарожжа
**joy** радасць
**judge** суддзя; судзіць; меркаваць; ***judging by*** мяркуючы па
**judicial** судовы /*ўлада*/
**judo** дзюдо
**jug** гладышка, збан
**juice** сок
**juicy** сакавіты
**July** ліпень
**jump** скачок; скочыць; ***to j. out*** выскачыць
**June** чэрвень
**jungle** джунглі
**junior** малодшы
**just** I якраз, акурат, толькі, проста, толькі што; ***j. as well*** гэтаксама; ***j. like*** акурат як
**just** II справядлівы
**justice** справядлівасць; юстыцыя
**justify** апраўдаць /*знайсці апраўданне, патлумачыць прычыну*/

## K

**keen** востры; захоплены, апантаны; ***to be k. on*** захапляцца *чым-н.*
**keep** трымаць; захоўваць; змушаць; ***to k. on*** працягваць; ***to k.***+ *gerund* працягваць *што-н. рабіць*
**kept** *pi, pp да* keep
**kettle** чайнік (*для вару*)
**key** ключ; ключавы

**kick** біць нагою, даваць насцака
**kid** казяня; дзіця
**kill** забіць, загубіць
**killer** забойца, “кілер”
**kilo** *скарот да* kilogramme кіло
**kilogramme** кілаграм
**kilometre** кіламетр
**kind** род; кшталт; добры; ***a k. of*** такі, нейкі, нешта накшталт; ***some k. of*** якісьці, нейкі; ***what k. of...?*** што за..? які..?
**kindly** ласкава
**kindness** дабрыня
**king** кароль
**kingdom** каралеўства
**kiss** пацалунак; па/цалаваць
**kit** рэчы; набор, камплект, рыштунак
**kitchen** кухня; кухонны
**kite** паветраны змей
**kitten** кацяня
**knee** калена
**kneel down** укленчыцца, стаць на калені
**knew** *pi да* know
**knife** (*pl* knives) нож
**knit** вязаць
**knives** *pl да* knife
**knock** стук; стукаць, ударыць, вуцяць
**know** ведаць, пазнаць
**knowledge** веда, веды
**known** *pp да* know; вядомы

## L

**laboratory** лабараторыя
**labour** праца; працоўны; ***L. party*** Лейбарысцкая / Працоўная партыя (*у Вялікабрытаніі, Аўстраліі*)
**labourer** працоўны
**lack** нястача, адсутнасць; нехапаць, бракаваць
**ladder** драбіны
**lady** жанчына; пані; ледзі
**laid** *pi*, *pp да* lay
**lain** *pp да* lie II
**lake** возера; азёрны
**lamp** лямпа
**lamppost** ліхтарны слуп
**land** зямля, суша; краіна; высадзіцца, прызямліцца
**landing** пасадка, прызямленне
**landscape** краявід, пейзаж
**language** мова
**lap** лано, калені, ногі
**large** вялікі, буйны
**largely** шырока, пераважна
**last** I апошні; мінулы; ***l. year*** летась; ***l. night*** учора ўвечары; ***at l.*** нарэшце
**last** II доўжыцца, працягвацца;
**late** позні; позна; апошні; ***to be l.*** спазняцца
**lately** надоечы, апошнім часам
**later** пазней, праз
**latitude** шырыня /*геаграфічная*/
**Latvian** латыш; латышскі
**laugh** смяяцца
**laughter** смех
**launch** запускаць /*ракету*/; пачаць /*кампанію*/
**law** закон; права
**lawyer** юрыст, адвакат
**lay** I па/класці; ***to l. the table*** сабраць на стол
**lay** II *pi да* lie II
**lazy** лены, лянівы
**lead** весці; узначальваць, кіраваць
**leader** лідэр, кіраўнік
**leadership** кіраўніцтва
**leading** вядучы
**leaf** (*pl* leaves) ліст
**leaflet** улётка, лістоўка
**league** ліга, хаўрус
**leak** выцяканне, цечыва; цячы, выцякаць
**learn** вучыць, вывучаць, даведацца
**least** найменшы; ***at l.*** прынамсі
**leather** скура; скураны
**leave** дазвол; адпачынак; пакідаць; выходзіць; пайсці; заставацца; ***to l. school*** скончыць школу
**leaves** *pl да* leaf; лісце, лістота
**led** *pi*, *pp да* lead
**left** I левы; ***on the l.*** злева; ***on one’s l.*** злева ад *каго-н.*; ***to the l.*** налева
**left** II *pi*, *pp* leave; пакінуты; які застаўся
**leg** нага /*ад ступака і вышэй*/
**legal** законны, праўны, юрыдычны
**legislative** заканадаўчы /*улада*/
**leisure** вольны час
**lemon** лімон
**lend** пазычаць /*некаму*/

**length** даўжыня; ***what l. is the room?*** якая даўжыня пакою?
**lengthy** доўгі, працяглы
**lenient** мяккі, памяркоўны, цярплівы
**less** меншы; меней, менш
**lesson** урок
**let** (*pi*, *pp* let) дазваляць; ***l. us*** давайце; ***to let in*** у/пускаць
**letter** літара; ліст; ***four-l. word*** непрыстойнае слова; ***registered l***. заказны ліст
**letter-box** паштовая скрынка
**lettuce** салата /*расліна*/
**level** уз/ровень, ступень
**liberate** вызваляць
**liberty** воля, свабода
**librarian** бібліятэкарка
**library** бібліятэка
**licence** дазвол, пасведчанне
**lie** I хлусня, мана; ілгаць
**lie** II ляжаць
**life** (*pl* lives) жыццё
**lifetime** усё жыццё
**lift** ліфт; падымаць; ***to give*** *smb* ***a lift*** падвезці *каго-н.*
**light** I лёгкі; светлы
**light** II святло; запаліць
**like** I як, падобна як, быццам; ***just l***. акурат як; ***to look l***. выглядаць як, быць падобным да; ***something l***. прыблізна; накшталт
**like** II (*не ўжываецца ў present continuous*) падабацца, любіць, упадабаць; ***I would l***. мне хацелася б, я хачу
**likely** верагодна, падобна на тое, што; ***to be l. to*** + *verb* хутчэй за ўсё, верагодней за ўсё + *дзеяслоў*; ***he is l. to come*** ён, напэўна, прыдзе
**likeliness** верагоднасць
**limit** мяжа; абмяжоўваць
**line** радок; лінія
**link** сувязь, злучэнне, звяно; злучаць, звязваць /*камунікацыямі*/
**lion** леў
**lip** губа
**lipstick** губная памада
**liquid** вадкасць; вадкі
**list** спіс
**listen** слухаць; ***to l. to the radio*** слухаць радыё
**lit** *pi*, *pp да* light; запалены
**literally** літаральна
**literary** літаратурны
**literature** літаратура
**litre** літр
**litter** смецце
**little** малы, маленькі; мала /*пры незлічоных назоўніках*/; ***a l***. трохі, небагата; ***l. by l***. патроху, пакрысе, паступова
**Lithuanian** літовец; літоўскі
**live** I жывы
**live** II жыць
**lives** *pl да* life
**living**: ***l. room*** гасцёўня; ***to make one's l. by*** зарабляць сабе на хлеб/ жыццё тым, што..; ***l. standar***d узровень жыцця
**load** груз; нагружаць
**loaf** (*pl* loaves) бохан, кулідка, батон
**loan** пазыка; пазычаць
**loaves** *pl да* loaf
**local** мясцовы, тутэйшы
**lock** замок; замыкаць
**lonely** самотны, адзінокі
**long** доўгі; працяглы; доўга, задоўга да; даўжынёю; ***the plank is three metres l***. дошка даўжынёю тры метры
**look** пазіраць, глядзець; выглядаць /*мець выгляд*/; ***to l. after*** даглядаць; ***to l. around*** азірнуцца; ***to l. for*** шукаць; ***to l. forward to*** чакаць з нецярплівасцю***; to l. out*** пазірнуць, выглянуць; ***l. out!*** беражыся!, асцярожна! ***to l. like*** здавацца, выглядаць, быць падобным да; ***it l.s like*** выглядае, што..; ***to l. up*** узняць позірк, падняць галаву; пазірнуць, пашукаць (*слова ў слоўніку*)
**looking-glass** люстэрка
**loop** пятля
**lord** лорд, валадар, правадыр; ***L***. Пан, Бог
**lorry** грузавік
**lose** губляць
**loss** страта
**lost** *pi*, *pp да* loose; згублены
**lot**: ***a l. of, l.s of*** шмат, гібель, мноства
**loud** гучны; гучна
**loudly** гучна
**love** каханне; кахаць (*не ўжываецца ў present continuous*); ***to be in l. with*** кахаць

*каго-н.*
**lovely** прыгожы, чароўны
**low** нізкі; нізка
**lowland** нізіна
**loyal** верны
**luck** удача, шанцаванне, шчасце; ***bad l.*** няшчасце, няўдача; ***to have bad l.*** не па/шанцаваць
**luckily** нашчасце
**lucky** шчаслівы; ***to be l. to*** + *inf* шанцаваць; ***he was l. to win the prize*** яму пашанцавала атрымаць прэмію
**luggage** багаж
**lump** камяк, кавалак
**lunch** абед, полудзень; абедаць, палуднаваць
**lunch-time** абед, паўдзён
**lyceum** ліцэй

## M

**'m** /*у скароце*/ am; I'm ==I am
**macaroni** макарона
**machine** машына
**mad** вар'ят; вар'яцкі
**madam** пані, мадам
**made** *pi*, *pp да* make; зроблены; ***to be m. of*** быць зробеным з
**magazine** часопіс
**magic** магічны, чароўны
**magician** чараўнік
**magnificent** цудоўны, пышны
**mail** пошта; пасылаць поштаю
**mailbox** паштовая скрынка
**main** галоўны, асноўны
**mainly** пераважна
**maintain** падтрымліваць, захоўваць
**maize** кукуруза, маіс
**major** большы, галоўны
**majority** бальшыня
**make** рабіць; ***to m. smb*** + inf змушаць *каго-н.* зрабіць *што-н.*; ***to m. a bed*** заслаць ложак; ***to m. sure*** упэўніцца, пераканацца, праверыць
**make- up** касметыка, грым
**mammal** сысун
**man** (*pl* men) чалавек; мужчына; салдат
**manage** кіраваць, загадваць; спраўляца; удавацца; абыходзіцца
**manager** кіраўнік, загадчык, менеджэр
**mankind** чалавецтва
**manner** лад, спосаб, чын, манера; ***in what m.*** як, якім чынам; ***in this m.*** гэтак, такім чынам
**manual** ручны
**manufacture** вытворчасць; выпускаць
**many** багата, шмат /*пры злічоных назоўніках*/ ***how m.?*** колькі? /*пра злічоныя назоўнікі*/
**map** карта
**maple** клён; кляновы
**March** сакавік; сакавіцкі
**march** шэсце, марш
**marine** марскі
**mark** след, знак; адзнака; адзначаць
**market** рынак, базар; ***m. economy*** рынкавая эканоміка
**marriage** шлюб; вяселле
**married** жанаты, замужняя; ***to be m.*** быць жанатым/ замужам; ***to be m. to*** быць жанатым з/ замужам за; ***to get m.*** ажаніцца, пайсці замуж
**marry** жаніцца, ісці замуж
**marsh** балота
**marvellous** дзівосны, цудоўны
**mask** маска
**mass** маса, процьма; ***m. media*** сродкі масавай камунікацыі/ інфармацыі
**massacre** па-зверску забіваць
**masterpiece** шэдэўр
**match** I матч; пасаваць, падыходзіць
**match** II запалка; ***m. box*** карабок запалак; ***to strike a m.*** зачырыць/ запаліць запалку
**material** матэрыял; матэрыяльны, фізічны
**mathematics**, **maths** матэматыка
**mathematician** матэматык
**matter** справа, пытанне; рэчыва; мець значэнне, быць важным; no m. няважна, усёроўна; ***It doesn't m.!*** нічога!; ***what is the m. with..?*** што (здарылася) з..?
**mature** спелы; сталы
**May** травень; ***M. Day*** Першатравень
**may** магчы, мець дазвол/ магчымасць
**maybe** магчыма, напэўна
**mayor** бурмістр

**me** мяне, мне; ***it's me!*** гэта я!
**meadow** луг
**meal** ежа, страва
**mean** значыць, абазначаць; думаць, мець на ўвазе
**means** сродкі; ***by all m***. любым чынам
**meant** *pi*, *pp да* mean
**meantime**: ***in the m***. тым часам
**measure** мера; мераць; ***to take m.s*** узяць меры
**meat** мяса; мясны
**mechanical** механічны
**medical** медычны
**medicine** медыцына; лекі
**meet** сустракаць; знаёміцца; задавальняць /*патрэбы*/
**meeting** спатканне, сход
**melt** раставаць; плавіцца
**member** сябра, член
**memory** памяць
**men** *pl да* man; мужчыны, салдаты, людзі
**menace** пагроза; пагражаць
**mend** ладзіць, рамантаваць; латаць, цыраваць
**mental** разумовы; інтэлектуальны; псіхічны
**mention** згадка; згадваць; ***don't mention it!*** няма за што! /*адказ на падзяку*/
**merry** вясёлы
**mess** бязладдзе
**message** паведамленне; запіска
**met** *pi*, *pp да* meet; сустрэты
**metal** метал; металічны
**metre** метр
**Mexican** мексіканец; мексіканскі
**mice** (*pl да* mouse) мышы
**microwave** мікрахвалевы; ***m. oven*** мікрахвалевая печ
**middle** сярэдзіна; сярэдні; ***in the m. of*** пасярод, у сярэдзіне чаго-н.
**might** магутнасць, моц; *гл.*may
**mild** мяккі /*не суровы, не строгі*/
**mile** міля /*англійская-1609м, ВКЛ-7798м*/
**military** вайсковец; вайсковы
**milk** малако; даіць
**milkmaid** даярка
**million** мільён
**mincer** мясарубка
**mind** розум, галава; думка, меркаванне; зважаць; пярэчыць; ***to my m***. на маю думку
**mine** I мой /*замяняе раней памянёны назоўнік*/
**mine** II капальня, шахта
**miner** шахтар, шахцёр, гарняк
**mineral** мінерал; мінеральны
**minister** міністр; святар
**ministry** міністэрства
**minor** нязначны, неістотны
**minority** меншыня
**minus** мінус; адняць
**minute** хвіліна; дробны
**miracle** цуд
**mirror** люстра
**misfortune** бяда
**miss** I дзяўчына, паненка
**miss** II промах; прамахнуцца прапусціць; нудзіцца, сумаваць; ***I m. you*** я па табе сумую; ***better kiss the miss than miss a kiss*** лепей пацалаваць дзяўчыну, чым праміргаць пацалунак
**mist** туман
**mistake** памылка; памыляцца
**mistaken** памылковы
**mister** пан, містэр /*ужываецца заўсёды ў скароце* Mr *перад прозвішчам ці назваю пасады* /
**mistress** пані, місіз; /*ужываецца ў скароце Mrs перад прозвішчам ці назваю пасады*/; гаспадыня; настаўніца
**misunderstand** не так/ няправільна зразумець
**misunderstanding** непаразуменне
**mix** мяшаць, змяшаць, перамяшаць
**mixed** змешаны; супярэчлівы, неадназначны /*пачуццё, рэакцыя*/; ***m. feeling*** супярэчлівае пачуццё
**mixer** міксер
**mixture** сумесь
**mobile** рухомы
**model** мадэль; узор; узорны
**moderate** умеркаваны
**modern** сучасны
**modernize** мадэрнізаваць, удасканаліць
**modest** сціплы
**modesty** сціпласць
**moment** момант, хвіліна, імгненне; ***at the***

***m.*** зараз
**Monday** панядзелак; ***on M***. у панядзелак
**money** грошы; ***to make m***. зарабляць грошы
**monkey** малпа
**monster** пачвара
**month** месяц
**monument** помнік
**mood** настрой; *грам*. лад
**moon** Месяц
**more** болей; ***any m***. яшчэ, болей; ***the m***. ... ***the m***. ... чым... тым...
**morning** раніца; ***in the m***. раніцаю; ***good m***.! добры дзень! /*кажуць уранні*/
**mosquito** камар
**most** бальшыня, большасць; найбольшы; больш за ўсё
**mostly** пераважным чынам
**mother** маці; матчын; ***m. tongue*** родная мова
**motherland** Айчына
**motor** рухавік
**motorcycle** матацыкл
**motto** дэвіз
**mountain** гара
**mountainous** гарысты, горны
**mouse** (*pl* mice) мыш /*і кампутарная*/
**mouth** рот
**move** рухаць, рухацца; пераязджаць
**movement** рух
**Mr**. пан, містэр /*ужываецца перад прозвішчам ці пасадаю*/
**Mrs**. пані, місіз /*ужываецца перад прозвішчам замужняй жанчыны*/
**much** багата, шмат /*ужываецца з незлічонымі назоўнікамі*/; ***m. more*** куды болей, нашмат болей; ***how m***. колькі /*пра незлічоныя назоўнікі*/; ***very m***. вельмі, надта
**mud** гразь, глей
**muddy** брудны, гразкі
**mug** карэц
**multiple** шматлікі
**multiplication** множанне
**mum**, **mummy** мама
**murder** забойства; забіваць
**murderer** забойца
**museum** музей
**mushroom** грыб
**music** музыка; ***classical m***. класічная музыка; ***pop m***. поп-музыка
**musical** музычны; м’юзыкэл /*жанр тэатральнага відовішча*/
**musician** музыка, музыкант
**must** павінен, трэба, мусіць; *ужываецца толькі ў ц.ч.; у будучым і мінулым замяняецца выразам* to have to + *inf*
**mustard** гарчыца
**mute** нямы
**my** мой, свой/ свае
**myself** сам, сябе
**mystery** таямніца, загадка

## N

**nail** I ногаць, кіпець
**nail** II цвік; забіць цвік, прыбіць цвіком
**name** імя, назва; назваць
**namely** менавіта
**napkin** сурвэтка
**narrow** вузкі, цесны
**nasty** паганы, пранцаваты; непрыемны
**nation** нацыя, народ
**national** нацыянальны
**nationality** нацыянальнасць
**nationwide** агульнанацыянальны
**native** родны; карэнны; ***n. people*** карэнныя жыхары, аўтахтоны; ***n. speaker*** носьбіт мовы
**natural** прыродны, натуральны
**naturally** натуральна
**nature** прырода, характар
**naughty** брыдкі; непаслухмяны
**naval** ваенна-марскі
**navy** вайсковы флот
**near** каля, блізу, побач; набліжацца
**nearby** побач; суседні
**nearly** блізу, амаль, ледзь не
**neat** чысты, ахайны
**necessary** неабходнае; неабходны, патрэбны
**necessarily** непазбежна
**neck** шыя
**necklace** кара́лі
**need** патрэба; мець патрэбу
**needle** іголка
**negative** адмоўны

**neglect** запусціць, занядбаць
**negligence** нядбайнасць
**Negro** мурын
**neighbour** сусед; суседскі
**neighbourhood** суседства; наваколле, акруга
**neither** ніякі; ніводзін; ***n**... **nor**...* ні... ні.., ані… ані…
**nephew** нябож, пляменнік
**nerve** нерв
**nervous** нервовы
**nest** гняздо
**net** I сетка
**net** II чысты
**network** сетка /*чыгуначная, тэлевізійная*/
**never** ніколі; ***Never mind!*** дарма!,няважна!
**nevertheless** тым не менш, аднак, усё ж
**new** новы
**news** /*не мае мн. л.*/ навіна
**newspaper** газета; газетны
**next** наступны; суседні; потым; амаль; ***n. to*** побач з; ***n. day*** назаўтра, на наступны дзень; ***n. year*** налета
**nice** прыгожы, файны, добры; ***n. day*** пагодны дзень; ***n. weather*** пагода, добрае надвор’е
**niece** нябога, пляменніца
**night** ноч; ***at n.***, ***by n.***, ***in the n.*** уначы, ноччу
**nightingale** салавей
**nil** нуль; ***three-n.*** /*рахунак у гульні*/ тры-нуль
**nine** дзевяць
**nineteen** дзевятнаццаць
**ninety** дзевяноста
**ninth** дзевяты
**no** не; ніякі
**noble** шляхетны, высакародны
**nobody** ніхто
**nod** ківаць /*галавою*/
**noise** шум, гоман
**noisy** шумны
**none** ніхто, ніводзін; нішто
**nonsense** глупства, бязглуздзіца
**noon** паўдзён
**nor** ні
**normal** звычайны, нармалёвы, нармальны
**north** поўнач; паўночны; ***n. east*** паўночны усход; ***n. west*** паўночны захад; ***in the n.*** на поўначы
**northern** паўночны
**Norwegian** нарвежац; нарвежскі
**nose** нос
**not** не; ***n. at all*** няма за што /*адказ на падзяку*/
**note** запіска; нота; заўважаць
**notebook** нататнік, запісная кніжка
**notice** абвестка, паведамленне; афіша; заўважаць
**nothing** нішто, нічога; ***for n.*** дарма, бясплатна
**notice** абвестка; паведамленне
**notion** паняцце, ідэя
**nought** нуль
**noun** назоўнік
**novel** раман
**novelty** навізна
**November** лістапад
**now** зараз, цяпер
**nowadays** цяпер, у нашыя дні
**nowhere** нідзе; недзе
**nuclear** ядро; ядравы
**number** нумар; налічваць; ***a n. of*** шэраг чаго-н.; ***a great n. of*** мноства, багата
**numerous** шматлікі
**nurse** медычная сястра
**nut** арэх; ***Are you n.s?*** ты мо здурэў?!

**O**

**oak** дуб; дубовы
**oats** авёс
**obedient** паслухмяны
**obey** слухаць, падпарадкоўвацца
**object** прадмет; аб‘ект; пярэчыць
**obligation** абавязак
**obligatory** абавязковы
**observation** назіранне
**observe** назіраць; сачыць; захоўваць, прытрымлівацца /*правоў, правілаў*/
**obstacle** перашкода
**obstinate** упарты
**obtain** атрымаць
**obvious** відавочны, яўны
**occasion** нагода, выпадак

**occasional** выпадковы
**occasionally** выпадкова
**occupation** занятак; акупацыя
**occupy** займаць, акупаваць
**occur** здарацца, адбываца; ***it o.ed to me*** я падумаў, мне ў галаву прыйшла думка
**ocean** акіян
**October** кастрычнік; кастрычніцкі
**odd** дзіўны, незвычайны, няцотны
**of** ад, з; *перадае адносіны роднага склону;* ***a box made of paper*** скрыначка, зробленая з паперы; ***a kilo of sugar*** кіло цукру; ***out of*** з /*адкуль, з чаго*/
**off** з, ад /*перадае паняцце выдалення чаго-н.*/; ***to take o***. зняць; ***off*** выключаны /*тэхнічны надпіс*/
**offend** пакрыўдзіць
**offensive** наступ; наступальны; крыўдны
**offer** прапанова; прапанаваць
**office** праца, служба, пасада; кантора; ***newspaper o***. рэдакцыя газеты
**official** афіцыйная асоба; службовы, афіцыйны
**often** часта
**oh** о, ого, эх
**oil** алей; нафта
**old** стары; ***how o. are you?*** колькі табе гадоў? ***I am 11 years old*** мне 11 гадоў
**Olympic** алімпійскі; ***O. games*** Алімпійскія гульні
**on** на; пра; ***on Wednesdays*** па серадах; ***on May the fifth*** пятага траўня; ***on*** уключаны /*тэхнічны надпіс*/
**once** аднойчы, нeяк, некалі; адзін раз; ***o. again***, ***o. more*** яшчэ раз; ***at o***. адразу ж
**one** адзін; *таксама замяняе раней памянёны назоўнік*
**one's** свой, чый-небудзь
**oneself** /*зваротны займеннік, мае формы myself, yourself, himself, herself, itself, ourselves, yourselves, themselves*/ сябе, сабе; сам
**one-sided** аднабаковы
**onion** цыбуля
**only** толькі, усяго (толькі); ***the o***. адзіны
**onto** на /*зверху*/
**open** адчынены; шчыры; адчыняць; разгарнуць /*кнігу*/; расплюснуць /*вочы*/
**opera** опера; оперны; ***o. house*** оперны тэатр
**operation** аперацыя
**opinion** думка, меркаванне; ***in my o***. на маю думку
**opportunity** магчымасць, нагода
**oppose** працівіцца, пярэчыць
**opposite** супрацьлеглы; насупраць, упоравень
**opposition** супраціў, супрацьдзеянне, апазіцыя
**oppress** прыгнятаць
**oppresison** прыгнёт
**optimistic** аптымістычны
**option** выбар
**optional** факультатыўны, неабавязковы
**or** ці; ***either... or...*** ці... ці...
**oral** вусны /*не пісьмовы*/
**orally** вусна
**orange** апельсін; аранжавы
**orchestra** аркестр
**order** парадак; ордэн; загадаць; заказваць; ***in o. to*** + *дзеяслоў* для таго каб
**ordinary** звычайны
**ore** руда
**organism** арганізм
**organization** арганізацыя
**organize** арганізаваць
**origin** паходжанне; прычына
**original** першы, першапачатковы; арыгінальны
**originally** спярша
**originate** узнікаць
**orphan** сірата
**ostrich** страус
**other** іншы, другі
**otherwise** інакш, а то
**ought to** трэба, павінен, мусіць
**our** наш, свой/ свае
**ours** наш /*замяняе памянёны назоўнік*/, свае
**ourselves** (*1 а. мн. л.)* сябе, сабе; самі
**out** з, надвор, прэч; ***o. of*** з; /*паказвае рух вонкі*/; ***to go o***. выйсці; ***to be o***. адсутнічаць, не быць
**outdoor** пад адкрытым небам, на вольным паветры, на вуліцы, на двары, за горадам
**outdoors** на двары, на вуліцы

**outing** пагулянка за горадам, пікнік
**outrageous** абуральны
**outside** знешні, вонкавы; знадворку, на двары, вонку; па-за, за, каля, побач з
**outstanding** выбітны, выдатны
**oval** авальны
**oven** печ; духоўка
**over** на, праз, над, паверх, наверсе; болей, звыш; занадта; старэй за; ***children o. 14*** дзеці старэйшыя за 14 год; ***to be o.*** канчацца; ***o. and o. again*** яшчэ і яшчэ (раз)
**overcome** адолець, перамагаць
**owe** павінен, быць вінным
**owing to** дзякуючы *чаму-н*
**own** уласны; валодаць
**owner** уласнік
**ownership** уласнасць
**ox** (*pl* oxen) бык, вол
**oxygen** кісларод
**ozone** азон; азонавы; ***o. layer*** азонавы пласт

## P

**pacific** мірны; ***P. Ocean*** Ціхі акіян
**pacify** замірыць
**pack** клунак, пачак; зграя; пакаваць
**packet** пакет, скрутак
**page** старонка
**paid** *pi, pp да* pay; заплочаны; платны
**pail** вядро
**pain** боль; балець
**painful** балючы; пакутлівы
**paint** фарба; маляваць; фарбаваць
**painter** мастак; маляр
**painting** карціна; жывапіс
**pair** пαра /*дзве рэчы*/; ***in p.s*** парамі, у парах
**palace** палац
**pale** бледны, белы
**palm** далоня
**pan** каструля; ***frying p.*** патэльня
**pancake** блінец
**panic** паніка; панічны
**pants** трусы /*дамскія*/
**paper** папера; папяровы
**parallel** паралель; паралельны
**parcel** пакунак, пасылка
**pardon** дараванне; дараваць; ***I beg your p.*** даруйце мне
**parents** бацькі
**park** парк
**parking** паркоўка /*машыны*/
**parliament** парламент
**parrot** чыюк
**part** частка; ***to take p. in*** браць удзел у
**partial** частковы
**participant** удзельнік
**participate** удзельнічаць
**participle** дзеепрыметнік; ***past p.*** дзеепрыметнік мінулага часу
**particle** часцінка; часціца
**particular** падрабязнасць, дэталь; асаблівы, асобы, адмысловы; ***in p.*** асабліва; канкрэтна
**particularly** асабліва
**partner** партнёр
**party** вечарынка; партыя; партыйны
**pass** пропуск; перадаць, падαць; мінаць, праходзіць паўз; ***to p. an examination in*** здаць экзамен па
**passage** праход; калідор
**passenger** пасажыр
**passion** захапленне
**passionate** палымяны, палкі
**passive** абыякавы, неактыўны; залежны /*стан дзеяслова*/
**password** пароль
**past** I мінулы, прошлы; мінуўшчына
**past** II паўз; пасля***; at half p. three*** а палове чацвёртай гадзіны; ***five minutes p. two*** пяць хвілін трэцяй гадзіны
**pastime** занятак, бавенне часу
**patience** цярплівасць
**patient** пацыент; цярплівы
**pattern** узор, малюнак; лад
**pavement** ходнікі, тратуар
**paw** лапа
**pay** плата; плаціць; ***to p. attention to*** зважаць, надаваць увагу *чаму-н.*
**pea** гарох
**peace** мір
**peaceful** мірны
**pear** ігруша
**peasant** селянін; сялянскі
**peat** торф

**peep** падглядаць; ***p. show*** піпшоў
**pen** ручка
**pencil** аловак; ***p. case*** пенал
**penetrate** пранікаць, прабрацца
**peninsula** паўвыспа, паўвостраў
**pension** пенсія
**pensioner** пенсіянер/ка
**people** людзі, народ
**pepper** перац
**per** у, на, праз; ***p. cent*** ад соткі, працэнт
**perfect** дасканалы; цудоўны
**perfectly** дасканала, цудоўна
**perform** выконваць, граць /*ролю*/, рабіць
**performance** выкананне; спектакль
**perfume** парфума, духі
**perhaps** напэўна, бадай, мусіць, магчыма
**period** перыяд
**permission** дазвол
**permit** дазвол; дазваляць
**persecute** пераследаваць, уціскаць
**persecution** пераслед, уціск
**perseverance** настойлівасць
**persist** заставацца, працягвацца
**person** асоба, чалавек; ***a p. of influence*** уплывовая асоба
**personal** асабісты, персанальны
**personality** асоба, індывідуальнасць
**personally** асабіста
**persuade** пераканаць
**pet** жывёла для забаўкі /*кот, чыюк, у каго што*/
**petrol** бензін
**petroleum** нафта
**philosophy** філасофія
**phone** тэлефон; тэлефанаваць
**photo** фота/здымак, фатаграфія
**phrase** сказ
**physical** фізічны; ***p. training*** фізічнае выхаванне, фізкультура
**physics** фізіка
**piano** піяніна
**pick** рваць, збіраць; ***to p. up*** падабраць, падняць, узяць /*слухаўку тэлефона*/; ірваць /*кветкі*/
**picnic** пікнік
**picture** карціна; малюнак; фатаздымак; карцінны; ***to take p.s*** фатаграфаваць
**picturesque** маляўнічы
**pie** пірог
**piece** кавалак, частка
**pig** свіння, парася
**pigeon** голуб
**pike** шчупак
**pile** стос, куча
**pill** таблетка
**pillow** падушка
**pilot** лётчык; пілот, аўтагоншчык; лоцман
**pin** шпілька, іголка; пры/калоць; ***p. up*** фотаздымак часопіснай прыгажуні
**pine** хвоя, сасна
**pineapple** ананас
**pink** ружовы
**pipeline** трубацяг, трубапровад
**piper** дуда
**pity** шкадаванне, шкода; ***it's a p***. шкада
**place** месца, родны кут; паставіць, размясціць; ***my p***. мой родны кут, (мая хата, мая вёска, мой горад); ***p. of interest*** выдатнасць, цікавая мясціна; ***to take p.*** адбыцца
**plain** I раўніна
**plain** II просты, зразумелы; прамы, шчыры
**plan** план; планаваць
**plane** самалёт
**planet** планета
**plant** расліна; завод; саджаць
**plastic** пластмасавы
**plate** талерка
**platform** платформа, перон
**play** гульня; п'еса; гуляць; іграць
**player** гулец
**playground** пляцоўка для гульні
**playwright** драматург
**pleasant** прыемны
**please** дагаджаць, устаньчаць; падабацца; калі ласка
**pleased** задаволены
**pleasure** задавальненне
**pledge** абяцаць, клясціся
**plenty** шмат
**plot** кавалак зямлі; сюжэт
**plough** плуг; араць
**plum** сліва
**plumber** слесар-вадаправодчык, сантэхнік
**plus** плюс; дадаць
**p.m.** пасля паўдзёну, а другой палове дня;

***at 4 p.m***. а чацьвёртай гадзіне дня, а шаснаццатай гадзіне
**pocket** кішэня; кішэнны, кішанёвы; ***p. money*** кішанёвыя грошы
**pocketbook** кніга кішанёвага памеру
**poem** верш, паэма
**poet** паэт
**poetry** паэзія
**point** кропка; пункт; паказваць; ***to p.out*** падкрэсліваць
**pointer** указка, стрэлка
**poison** атрута
**poisonous** атрутны
**Pole** паляк
**pole** слуп; полюс
**police** паліцыя; ахоўваць, сачыць за парадкам; ***p. station*** паліцэйскі пастарунак
**policeman** паліцыянт
**policy** палітыка /*як агульнае стаўленне*/
**Polish** польскі
**polite** ветлівы
**politely** ветліва
**politeness** ветлівасць
**political** палітычны
**politician** палітык
**politics** палітыка /*як навука, як рэальныя дзеянні*/
**poll** галасаванне, выбары; ***to go to the p.s*** галасаваць, браць удзел у галасаванні
**pollute** брудзіць
**pollution** забруджанне
**pond** сажалка, копанка
**pool** сажалка; лужына /*разлітай вадкасці*/; ***swimming p***. плавальны басейн
**poor** бедны, гаротны, няшчасны; дрэнны, кепскі, слабы; ***p. health*** слабае здароўе
**pope** папеж, папа рымскі
**popular** народны; папулярны; ***to be p.with*** быць папулярным у/ сярод *каго-н.*
**population** насельніцтва
**pork** свініна
**porridge** аўсянка, аўсяная каша
**port** порт
**portrait** партрэт
**Portuguese** партугалец; партугальскі
**position** становішча
**positive** дадатны, станоўчы
**possess** валодаць, мець
**possession** уладанне, маёмасць
**possibility** магчымасць
**possible** магчымы
**possibly** магчыма, верагодна
**post** пошта; паштовы; пасылаць/*поштаю*/; ***p. office*** пошта, паштовая кантора
**postpone** адкладаць, адтэрміноўваць
**postage** паштовыя выдаткі; ***p. stamp*** паштовая марка
**postal** паштовы
**postbox** паштовая скрынка
**postcard** паштоўка
**poster** афіша, плакат
**postman** паштальён
**potatoe** бульбіна; ***p.s*** бульба
**pound** фунт /*мера вагі і грашова адзінка*/
**pour** ліць, наліваць
**poverty** беднасць, галеча
**powder** парашок; порах
**power** сіла, моц, энергія; улада; дзяржава; магутнасць; ***p. station*** электрастанцыя; ***to come to p***. прыйсці да ўлады
**powerful** магутны, моцны
**powerless** бяссільны
**practical** практычны
**practically** практычна
**practice** практыка; трэніроўка
**practise** практыкавацца, займацца
**prairie** прэрыя, стэп
**praise** пахвала; хваліць
**pray** маліцца
**prayer** малітва
**preceding** папярэдні
**precious** каштоўны
**precise** дакладны
**predict** прадказваць
**prefer** аддаваць перавагу, лічыць за лепшае
**preference** перавага
**prefix** прыстаўка
**prepare** пад/рыхтаваць
**preposition** прыназоўнік
**prescribe** прыпісваць, прызначаць /*лекі*/
**present** I падарунак; дарыць
**present** II цяперашні; прысутны;

прысутнічаць; прадстаўляць /*каго-н каму-н.*/; ***at p***. у цяперашні час
**preserve** захоўваць, ахоўваць
**president** старшыня; прэзідэнт
**press** друк, прэса; цiснуць, націскаць
**pretend** прытварацца, рабіць выгляд, пераўвасабляцца, прэтэндаваць
**pretty** прыгожы, сімпатычны
**prevent** (from + *gerund*) прадухіляць, не дапускаць, не даваць
**price** цана
**priceless** неацэнны
**pride** гонар
**priest** святар
**prime minister** прэм'ер- міністр
**prince** князь, прынц
**princess** князёўна, прынцэса
**principal** I галоўны, асноўны
**principal** II дырэктар школы
**principally** пераважна, пераважным чынам
**principle** прынцып
**print** адбітак; след; друкаваць
**printer** друкар; друкарка /*друкавальная прылада ў кампутарным абсталяванні*/
**prison** турма
**prisoner** зняволены, вязень
**prize** прыз
**probability** верагоднасць, вераемнасць
**probably** верагодна, напэўна
**problem** праблема, задача; ***to face a p*** сутыкацца з праблемаю
**process** працэс; апрацоўваць
**proclaim** абвяшчаць
**produce** прадукты; выпускаць, вырабляць; паказаць /*дакумент*/
**producer** вытворца
**product** выраб, прадукт
**production** вытворчасць; прадукцыя
**profession** прафесія
**professional** прафесіянал; прафесійны
**professor** прафесар
**profit** выгода, даход
**profound** глыбокі
**programme** праграма; планаваць, праграмаваць
**progress** поспех, дасягненне, прагрэс
**prohibit** забараняць
**project** праект
**prominent** выдатны, выбітны
**promise** абяцанне; абяцаць
**promote** садзейнічаць, спрыяць
**prompt** шпаркі, хуткі; дакладна; падказваць
**pronoun** займеннік
**pronounce** вымаўляць
**pronuciation** вымаўленне
**proper** уласны; належны
**properly** правільна, як след, належным чынам
**property** уласнасць, маёмасць; маёнтак
**propose** прапанаваць
**proposition** прапанова
**prosperity** заможнасць, дабрабыт, працвітанне
**protect** ахоўваць
**protection** ахова, абарона
**protest** пратэст; пратэставаць
**proud** гонар; горды; ***to be p. of*** ганарыцца
**prove** даказваць
**proverb** прымаўка
**provide** забяспечваць, даваць, пастаўляць (with); ***provided that*** пры ўмове, што...
**province** правінцыя, вобласць
**pub** паб, шынок
**public** грамадскі, дзяржаўны
**publication** апублікаванне, публікацыя
**publicity** рэклама, вядомасць
**publish** публікаваць, друкаваць
**pull** цягнуць; тузаць; ***to p. down*** руйнаваць, зносіць /*дом*/; ***to p. out*** выцягнуць, выняць
**pullover** пулавер, світар
**puls** пульс
**pumpkin** гарбуз
**punish** ушчуваць, караць
**punishment** пакаранне
**pupil** вучань
**puppet** лялька, марыянетка; лялечны; марыянеткавы
**pure** чысты
**purpose** мэта; ***on p***. наўмысна
**purposely** наўмысна, сведама
**push** штуршок; штурхаць; націскаць
**put** (*pi*, *pp* put) класці, ставіць; ***to p. away*** прыбіраць, прымаць; ***to p. down*** класці, апускаць; здушыць /*мяцеж*/; запісаць; ***to forward*** вылучыць, прапанаваць; ***to p. on***

апранаць, надзяваць***; to p. off*** адкласці, адтэрмінаваць; ***to p. out*** тушыць; выключаць; ***to p. up*** узводзіць, збудаваць; ***to p. up with*** змірыцца з
**puzzle** загадка, галаваломка

**Q**

**qualification** кваліфікацыя
**quality** якасць
**quantity** колькасць
**quarrel** сварка; сварыцца
**quarter** чвэрць; пятнаццаць хвілін; ***it's a q. past two*** пятнаццаць хвілін трэцяй гадзіны; ***it's a q. to three*** без пятнаццаці тры
**queen** каралева; царыца
**question** пытанне; распытваць; дапытваць; ***to ask a q***. задаць пытанне
**queue** чарга; стаяць у чарзе
**quick** хуткі, шпаркі
**quickly** хутка
**quiet** цішыня; ціхі; (***Be***) ***quiet***! Ціха!
**quietly** ціха, мірна
**quinsy** ангіна
**quite** зусім, цалкам

**R**

**rabbit** трус
**race** I гонка; імчаць
**race** II ра́са
**racial** расавы
**radiation** радыяцыя, спрамяненне
**radio** радыё
**radioactive** радыёактыўны
**radioactivity** радыёактыўнасць
**radish** радыска
**raft** плыт
**railroad, railway** чыгунка; чыгуначны; ***r***. ***station*** чыгуначны вакзал
**rain** дождж; ісці /*пра дождж*/; ***acid r***. кіслы дождж; ***it is raining dogs and cats*** дождж лье як з вядра
**rainbow** вясёлка
**raincoat** плашч
**rainforest** вільготны трапічны лес, гелея
**rainy** дажджлівы
**raise** падымаць; збіраць /*сродкі*/; ***to r. funds*** збіраць сродкі
**ran** *pi да* run
**rang** *pi да* ring
**rare** рэдкі, унікальны
